Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 МАЯ 2018 г. СЕРАДА № 96 (28712)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Паштальёна заменіць дрон?

СТАР. 5

Паслухаць салаўя, пакатацца на ровары

СТАР. 9

Дэпрэсія — хвароба жаночая

СТАР. 12

■ Клуб «Залатыя рукі»

МАЙСТАР СПРАВЫ НЕ БАІЦЦА!

Чым здзівілі і ўразілі ўдзельнікі WorldSkills Belarus 2018?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як вы думаеце, ці шмат страў можна прыгатаваць з буракоў? Ну боршч ці халаднік, ну селядзец пад шубай ці бурачкі з часнаком... Усё? Як жа вы памыляецеся. Загінайце пальцы...

Канапэ з крэмам з феты і грэцкага арэха з бурачнай ікрой, дэкарыраванае мікразелянінай. Закуска з казінага сыру з бурачным гелем і марынаванымі буракамі са слабасалёнай сёмгай, кедравымі арэшкамі з ёгуртна-гарчычным соусам. Буракі, фаршыраваныя рысам, разынкамі, арэхам і авакада ў гранатавым соусе, дэкарыраваныя кармелізаванымі цыбулінкамі і залатым пылком. Лустачкі кармелізаваных буракоў з кнелямі з мяккага тварожнага сыру і кедравымі арэшкамі, пакрытыя жэліраванай маркоўнай вуаллю з лёгкім бурачным мусам. Марынаваны бурак з падвэнджаным казіным сырам, соусам з базіліку і «зямлёй» з барадзінскага хлеба, дэкарыраваны мікразелянінай і ядомымі кветкамі. Хопіць? Вы не ўражаны? Ну, тады вось яшчэ пару страў... «Улітка» са свініны ў гарчычна-мядовай глазуры з бульбяна-мятным пюрэ і журавінавым соусам са спіралькамі з морквы, цукіні і чыпсай. Рулет са свіной карэйкі з костачкай, фаршыраванай яблыкамі з гарнірам з яблычнага і бульбянога пюрэ на соусе рамэска.

СТАР. 4

■ Летні адпачынак

Лагеры наводзяць апошні лоск

Сярэдні кошт пуцёўкі сёлета — 430 рублёў

Доўгачаканыя канікулы не за гарамі, і штогод усё большая колькасць бацькоў прапануе сваім дзецям традыцыйны адпачынак у лагеры. Гэта лета абяцае не стаць выключэннем.

Фота БелТА.

— Больш за трэць усіх дзяцей школьнага ўзросту ў апошнія гады праходзяць аздараўленне падчас летняй кампаніі. Наша краіна, дарэчы, адна з нямногіх на постсавецкай прасторы захавала і паспяхова развівае дзіцячае аздараўленне і адпачынак, — нагадала **кансультант галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК.**

Сёлета на гэтыя мэты з бюджэту выдаткавана 43 мільёны рублёў. Прычым большая частка — 41 мільён — пойдзе на тое, каб пуцёўкі зрабіць таннейшымі. Часткай сродкаў — каля паўтара мільёна — скарыстаюцца для набыцця пуцёвак для льготных катэгорый дзяцей. І паўмільёна рублёў выдаткуюць на дапамогу стацыянарным лагерам у аднаўленні матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Такія сродкі дазволяць арганізаваць адпачынак і аздараўленне для 377 тысяч дзяцей. З іх 220 тысяч адправяцца ў лагеры з дзённым прабываннем, 157 тысяч — з кругласутачным. Таксама летам плануецца аздаравіць 13 тысяч дзяцей-сірот і 4,5 тысячы дзяцей-інвалідаў.

СТАР. 7

ЛІЧБА ДНЯ

Больш як 3 тысячы даручэнняў

кіраўніка дзяржавы знаходзіцца на кантролі Адміністрацыі Прэзідэнта. Аб гэтым па выніках даклада Аляксандру Лукашэнку паведаміла кіраўнік Адміністрацыі Наталля Качанава. Паводле яе слоў, маюцца на ўвазе даручэнні Прэзідэнта, якія былі ім пастаўлены пры правядзенні розных мерапрыемстваў, у тым ліку рэспубліканскага ўзроўню, наведванні рэгіёнаў. У ліку даручэнняў — пытанні, якія датычацца насельніцтва, развіцця рэгіёнаў, выплаты заработнай платы, цэнавай палітыкі, занятасці. Наталля Качанава ўдакладніла, што прыкладна 81 працэнт усіх даручэнняў, якія знаходзяцца на кантролі, выкананы. Ёсць шэраг даручэнняў, тэрміны для рэалізацыі якіх яшчэ не надышлі. І ёсць нявыкананыя даручэнні, за што будзе строгі падыход.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі – будзе цікава!

МІСІІ ЗА МЯЖОЙ І ЎНУТРЫ КРАІНЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора разгледзеў кадравыя пытанні.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

МІРОНЧЫКА Дзмітрыя Леанідавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Швецыя;

ЛУКАШЭВІЧА Аляксандра Васілевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Балгарыя і па сумяшчальніцтве ў Грэчаскай Рэспубліцы і Рэспубліцы Кіпр;

КАЧАНАВА Вячаслава Георгіевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Эстонскай Рэспубліцы;

ПАЛЬЧЫКА Генадзя Уладзіміравіча — рэктарам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь;

АСТАПЕНКУ Уладзіміра Аркадзевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Чылі па сумяшчальніцтве;

КАЛЕСНІКА Валерыя Георгіевіча — пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН) па сумяшчальніцтве;

ГУСАЧЭНКУ Сяргея Аляксандравіча — намеснікам старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

ГРЫШКЕВІЧА Міхаіла Міхайлавіча — старшынёй Кобрынскага райвыканкама;

КАМІНСКАГА Аляксандра Віктаравіча — старшынёй Ляхавіцкага райвыканкама;

БОГУША Вадзіма Анатолевіча — рэктарам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі»;

ДРАГАНА Аляксандра Вячаслававіча — рэктарам установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт»;

ЛЁГКАГА Паўла Мікалаевіча — першым намеснікам міністра інфармацыі;

КРАСІНСКАГА Аляксея Дзмітрыевіча — дырэктарам дэпартамента па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў;

ГУСЕВА Ігара Уладзіміравіча — дырэктарам дэпартамента кантролю і нагляду за будаўніцтвам Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі;

ЧАЙКОЎСКАГА Аляксандра Іванавіча — генеральным дырэктарам дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах»;

ХВАЛЬКО Георгія Мікалаевіча — кіраўніком спраў Брэсцкага аблвыканкама.

Прызначаючы новых паслоў, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «І Эстонія, і Балгарыя — гэта блізкія нам дзяржавы. Яны добра да нас ставяцца, і людзі там разумеюць, ведаюць Беларусь. У Швецыі будзе крыху складаней, але, напэўна, і там ужо пэўны паварот у бок Беларусі адбыўся. І гэта тэндэнцыя будзе ўзмацняцца. Але са скандынаўскімі краінамі мы маем неапраўдана нізкі ўзровень адносін, а вучыцца ў іх можна шмат чаму: у фінаў, шведаў, нарвежцаў. Пачынаючы ад дрэваапрацоўкі і заканчваючы хакеем».

Прэзідэнт канстатаваў, што ў дыпламатаў, назначаных пасламі ў гэтыя краіны, работы будзе дастаткова. «Швецыя для нас — краіна вельмі важная, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Не важна, што там некаторыя палітыкі вельмі палітызаваліся ўжо, усяляк бывае. Але выбудоўваць адносіны з імі трэба. Вы ведаеце, што дадатнае сальда ў тавараабароце — гэта аксіёма, мы на гэта павінны працаваць. Усё будзе добра, калі будзе эканоміка».

Новых старшынь райвыканкамаў беларускі лідар сарыентаваў на развіццё сферы абслугоўвання. «Трэба даводзіць да ладу прадпрыемствы сэрвісу. Гэта і бытавое абслугоўванне, і швейныя, і цырульні. Каб мы маглі абслугоўваць людзей. Я не кажу ўжо аб гандлі. Вы жывяце ў раёнах, вам давядзецца гэтым займацца», — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама закрануў сферу сельскай гаспадаркі, якая натуральным чынам знаходзіцца ў цэнтры ўвагі кіраўнікоў у раёнах. «Работа з людзьмі, дысцыпліна і жалезны парадак на месцах, тэхналогіі», — акрэсліў кола задач кіраўнік дзяржавы.

У Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь неабходна цалкам перабудаваць сістэму адукацыі, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Трэба дакладна разумець: цяперашні кіраўнік — гэта чалавек, які ведае эканоміку, замежную мову і можа размаўляць з любым. На гэта трэба настройваць. Значыць, трэба вывучаць замежную мову больш, запрашаць туды больш людзей з эканамічным ці юрыдычным ухілам. Калі нам трэба, каб кіраўнік валодаў паліталогіяй, значыць, трэба вывучаць гэтыя навукі», — сказаў Прэзідэнт, адзначыўшы, што неабходна хутка перабудавацца і ўжо на 1 верасня ажыццяўляць набор тых людзей, якія сапраўды павінны атрымліваць адукацыю ў Акадэміі кіравання.

Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў назначэнне на пасады і іншых рэктараў. «Ратацыю я даручыў даўно пачаць. Таму што вельмі многія засядзеліся ўжо ў гэтых крэслах. Ужо няма таго, што патрэбна. Трэба асучасніць ВНУ. Трэба яшчэ на адну прыступку ўзняцца вышэй, выконваць заказ грамадства і эканомікі па тых кадрах, у якіх яны маюць патрэбу. Жыццё дыктуе свае ўмовы. Таму патрэбны новыя людзі», — сказаў Прэзідэнт.

Вераніка ПУСТАВІТ.

Аб правапарадку і аб хакеі

Міністра ўнутраных спраў, кіраўніка наглядальнага савета хакейнага клуба «Дынама-Мінск» Ігара Шуневіча ўчора прыняў з дакладам Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Падчас сустрэчы было абмеркавана, як змянілася колькасць здзейсненых у краіне злачынстваў, якіх змен патрабуе заканадаўства ў сферы наркакантролю, а таксама чаго не хапае беларускаму хакею.

Кіраўнік дзяржавы папрасіў далажыць аб тым, як складваецца крымінагенная абстаноўка ў краіне, якія праблемы ёсць у сферы наркакантролю. «Можа быць, мы дапусцілі пралікі ці памылкі падчас прыняцця адпаведнага заканадаўства. Я настойваў на ўзмацненні заканадаўства, асабліва да тых, хто вырабляе і пастаўляе, прадае сюды наркотыкі. Нам трэба строга дыферэнцыраваць спажыўцоў і пастаўшчыкоў», — адзначыў Прэзідэнт.

Другое пытанне, якое ўзнімалася падчас сустрэчы, — што надалей будзем рабіць з хакеем. Дакладней, са сферай адказнасці Ігара Шуневіча як кіраўніка наглядальнага савета хакейнага клуба «Дынама-Мінск». «Мы дамаўляліся, што «Дынама» стане базай для падрыхтоўкі гульцоў для зборнай каманды. Зараз я гляджу, федэрацыя ўсё больш ківае на «Дынама», што клуб не выканаў сваіх абавязкаў. Клуб «Дынама» кажа пра тое, што нам самім трэба гуляць і перамагаць, паказваць гульню. Таму ёсць свае інтарэсы. Дык вось, каб у нас не было разыходжанняў, трэба зрабіць так, каб сапраўды найлепшыя хакеісты гулялі ў «Дынама», а самыя лепшыя дынамаўскія гульцы — у зборнай», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар пракаментаваў тое, як беларуская зборная выступіла падчас чэмпіянату свету па хакеі, вылецеўшы з элітнага дывізіёна. «Гэта па справе. Іх месца там. Ім няма чаго рабіць з такой гульнёй у гэтым дывізіёне. Але пагадзіцца з гэтым мы ніяк не можам. Разбяромся асобна са зборнай», — паабяцаў кіраўнік дзяржавы. Важна вызначыцца, як ідзе фарміраванне каманды, як будуць наладжваць адносіны «Дынама» і Федэрацыя хакея ў будучыні.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што «Дынама» — гэта асноўны клуб, на базе якога трэба стварыць зборную Беларусі. «Усё павінна быць завострана на краіну. У нас павінны гуляць беларускія хакеісты і перш за ўсё варатар. Гэта не работа, што ў нас няма нармальнай абароны, ды і нападзення няма, калі за дзясятак матчаў не могуць забіць дзясятак галоў. Гэта не каманда. Праблем больш чым дастаткова», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Ігар Шуневіч, гаворачы аб крымінагеннай сітуацыі за апошнія пяць месяцаў, адзначыў, што яна істотна не змянілася. Назіраецца ўсё той жа трэнд зніжэння зарэгістраваных злачынстваў і здарэнняў. «Мяркуем, што мы дасягнулі таго ўзроўню ў арганізацыі барацьбы са злачыннасцю, які дазваляе ацаніць рэальны стан спраў у краіне ў гэтай частцы, а таксама адэкватна рэагаваць на ўсе выклікі і пагрозы, якія нясе ў сабе гэты сацыяльны феномен», — сказаў міністр. Па словах кіраўніка ведамства, дыферэнцыяцыя адказнасці паміж спажыўцамі і распаўсюджвальнікамі наркотыкаў ужо існуе. Яна замацавана ў Крымінальным кодэксе Беларусі, адзін з артыкулаў якога размяжоўвае саставы такіх злачынстваў і адказнасць за іх.

Вераніка ПУСТАВІТ

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ТРАМП ГАТОВЫ АДМОВІЦЦА АД СУСТРЭЧЫ З КІМ ЧЭН ЫНАМ

Пра гэта віцэ-прэзідэнт Майк Пенс расказаў у інтэрв'ю тэлеканалу Fox News, вытрымкі з якога прыводзіць Reuters. «Для Кім Чэн Ына было б вялікай памылкай думаць, што ён можа гуляць з Трампам», — падкрэсліў ён. На пытанне аб тым, ці можа Вашынгтон адмяніць саміт з Пхеньянам, Пенс адказаў: «Гэта не пытанне». Як вядома, саміт ЗША — КНДР папярэдне намечаны на 12 чэрвеня ў Сінгапуры. Аднак 16 мая ў Пхеньяне адзначылі, што могуць перагледзець свой удзел у ім. Гэта звязана з тым, што Паўночная Карэя не жадае весці перагаворы з краінай, якая, на яе думку, патрабуе ў аднабаковым парадку адмовіцца ад ядзернай зброі.

У БРАЗІЛІІ ДАЛЬНАБОЙШЧЫКІ БЛАКУЮЦЬ ДАРОГІ З-ЗА РОСТУ ЦЭН НА ДЫЗЕЛЬНАЕ ПАЛІВА

Кіроўцы-дальнабойшчыкі заблакавалі дзясяткі дарог у Бразіліі ў знак пратэсту супраць павышэння тарыфаў на дызельнае паліва. Як паведаміў тэлеканал Globo, акцыі пратэсту праходзяць па меншай меры ў 18 з 27 рэгіёнаў паўднёваамерыканскай краіны. Маніфестацыі пачаліся пасля таго, як дзяржаўная нафтагазавая кампанія Petrobras абвясціла пра новае павышэнне цэн на бензін і дызельнае паліва з аўторка. На мінулым тыдні гэтыя паказчыкі ўжо былі перагледжаны ў бок павелічэння пяць разоў запар. У Petrobras сітуацыю тлумачаць сусветным ростам цэн на энерганосьбіты. Найбольш маштабныя маніфестацыі праходзяць у густанаселеным штаце Сан-Паўлу, дзе аказаліся перакрытыя ў тым ліку аўтамагістралі, што вядуць у размешчаны ў горадзе Сантас буйны гандлёвы порт. На многіх дарогах утварыліся шматкіламетровыя заторы.

У НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ ЗША СТРАЛЯЛІ Ў 57 РАЗОЎ ЧАСЦЕЙ, ЧЫМ У АСТАТНІХ КРАІНАХ G7

У амерыканскіх школах, ВНУ і іншых навучальных установах выпадкі стральбы з 2009 года адбываліся ў 57 разоў часцей, чым у агульнай сукупнасці ў астатніх краінах «вялікай сямёркі», паведамляе CNN. Сёлета зламыснікі адкрывалі агонь у навучальных установах ЗША ў сярэднім адзін раз на тыдзень. Па даных тэлеканала, з 1 студзеня 2009 года да 21 мая 2018-га інцыдэнтаў са стральбой у ЗША было зафіксавана 288. За згаданы перыяд другое месца па колькасці падобных надзвычайных здарэнняў займае Мексіка, дзе адбылося восем выпадкаў стральбы ў навучальных установах. Трэцяе месца ў рэйтынгу аддадзена ПАР (6 выпадкаў), затым ідуць Індыя (5), Пакістан (4), Нігерыя (4), Афганістан (3), Францыя (2), Канада (2), Бразілія (2). Па адным выпадку са стральбой зафіксавана ў Грэцыі, Кітаі, Кеніі, Азербайджане, Германіі, Эстоніі, Турцыі, Венгрыі.

У ІНДЫІ АДЗНАЧАНА ЎСПЫШКА СМЯРОТНАГА ВІРУСА НІПАХ

Улады Індыі сцвярджаюць, што ў штаце Керала на паўднёвым захадзе краіны дзевяць чалавек загінулі, заразіўшыся вірусам Ніпах. Ад яго няма вакцын, 70 працэнтаў тых, хто захварэў, паміраюць. Аналізы пацвердзілі Ніпах у траіх загінулых, іншыя шэсць узораў пакуль правяраюць. Яшчэ 25 чалавек шпіталізаваны з сімптомамі гэтай інфекцыі ў індыйскім горадзе Кажыкодзе. Вірус Ніпах (NIV) узначальвае спіс з 10 самых небяспечных інфекцыйных захворванняў, успышкі якіх Сусветная арганізацыя аховы здароўя лічыць найбольш імавернымі. Прыродныя пераносчыкі віруса — лятучыя лісіцы, блізкія сваякі кажаноў, якія сілкуюцца садавіной. Чыноўнікі паведамлялі, што ў дамах загінулых ад інфекцыі знаходзілі манга, надкусаныя лятучымі лісіцамі. Сімптомы хваробы — жар, галаўны боль, санлівасць, праблемы з дыхальнымі шляхамі, дэзарыентацыя. Праз суткі ці двое хворы ўпадае ў кому.

■ Навасселле

Спартыўныя дасягненні пачынаюцца з медагляду

Гомельскі абласны дыспансер спартыўнай медыцыны цяпер мае прыстасаванае памяшканне. Адкрыццё ўстановы адбылося пры ўдзеле старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярыны Зянкевіч.

Чатыры гады таму дыспансеру быў перададзены былы будынак гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі па вуліцы Песіна. З абласнога бюджэту на капітальны рамонт і замену камунікацый выдаткавана 290 тысяч рублёў. Зараз тут створаны ўсе ўмовы, каб праводзіць медыцынскае абследаванне спартсменаў.

Дарэчы, спецыялістамі ўстановы праводзіцца паглыблены медыцынскі агляд навучэнцаў спартыўных устаноў Гомеля і вобласці, у тым ліку вучылішча алімпійскага рэзерву, абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па вяслярных відах спорту і членаў нацыянальнай зборнай Рэспублікі Беларусь. Таксама тут праводзяцца рэабілітацыйныя мерапрыемствы пасля атрыманых траўмаў, медыцынскае суправаджэнне спаборніцтваў рознага ўзроўню, вырашаюцца пытанні пра допуск да заняцця спортам. Аб гэтым расказаў галоўны ўрач абласнога дыспансера спартыўнай медыцыны Валерый Канаваленка:

— Гэта вельмі важная падзея для Гомельскай вобласці. Абноўлены дыспансер працуе ў дзве змены, штогод аказвае медыцынскія паслугі 47 тысячам чалавек. Сярод іх не толькі спартсмены і трэнеры, але і жыхары рэгіёна, якія вядуць здаровы лад жыцця. Пацыентамі становяцца і зусім юныя, калі пачынаюць у дзяцінстве займацца некаторымі відамі спорту.

Для паляпшэння дыягностыкі выкарыстоўваюцца самыя сучасныя распрацоўкі. Адным са значных кірункаў дзейнасці дыспансера з'яўляецца барацьба з ужываннем допінгу. Задачы, якія стаяць перад калектывам спецыялізаванай медыцынскай установы, зараз будуць вырашацца ў больш камфортных умовах і на новым узроўні.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■ Тры пытанні да ўлады

Гродна ў мініяцюры, «воднае таксі» па Нёмане і рэстаран пад адкрытым небам

Якія цікавінкі рыхтуе чарговы, 12-ы па ліку, рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, які адбудзецца ў Гродне 1-2 чэрвеня? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» запытаў кіраўніка гарадской вертыкалі ўлады Мечыслава ГОЯ.

Фота Аляксандра ЛАСМІНСКАГА.

— Мечыслаў Браніслававіч, чым плануеце здзіўляць шматлікіх гасцей фестывалю і гараджан?

— Па-першае, здзівім колькасцю наведвальнікаў. Я мяркую, што паглядзець і паўдзельнічаць у свяце зможа рэкордная колькасць чалавек (беручы лічбы папярэдняга фэсту і магчымасць прыехаць у Гродна ў межах бязвізавага рэжыму, а таксама тую дзейнасць па папулярызацыі фестывалю, што загадзя была праведзена), цікавасць у гасцей павінна быць вялікай. Што для гэтага робім? Менавіта да фестывалю прымеркавалі адкрыццё тэматычнага музея, які будзе называцца «Культурны цэнтр «Фестывальны». Кожны год мы будзем насычаць яго экспазіцыю новымі прадметамі. За час свайго існавання (а фестываль з'явіўся 24 гады таму) назапашана вялікая колькасць цікавых рэчаў, звязаных з фэстам, падарункаў, частку экспанатаў перададуць нацыянальныя дыяспары.

На першым паверсе, мяркую, гасцям і гараджанам будзе не менш цікава: тут пачне працаваць музей архітэктуры Гродна. Усю гістарычную забудову горада — а гэта 302 гектары — перададуць мініяцюры, выкананыя ў маштабе 1:200. Наведвальнікі пазнаёмяцца з аўтэнтычнымі будынкамі XVIII—XIX стагоддзяў. Дарэчы, тут можна будзе ўбачыць шмат пабудоў, якія не захаваліся да нашых дзён, таму ў першую чаргу экспазіцыя прынясе карысць у якасці нагляднага матэрыялу для адукацыйных мэт.

Акрамя таго, на пастаяннай аснове непадалёк ад тэатра лялек з'явіцца механічная дыярама: лялькі, якія круцяцца ды танцуюць па крузе. У першы дзень фестывалю кульмінацыяй свята, лічу, стане адкрыццё помніка Давыду Гарадзенскаму. Аб гэтым шмат пісалі гісторыкі і даўно марылі гродзенцы. Дзякуючы нестандартным ідэям, спонсарам, неабыякавым людзям такі помнік у нашым горадзе нарэшце з'явіцца.

Яшчэ да фестывалю нацыянальных культур пачне працаваць назіральная пляцоўка. Дарэчы, яна ўжо падрыхтаваная для выкарыстання, у дарозе толькі аптычная прылада, якая дазволіць глядзець з супрацьлеглага берага Нёмана на гістарычную частку горада.

Між іншым, у горадзе з'явіцца і шмат невялікіх аб'ектаў, у тым ліку «воднае таксі», якое пачне курсіраваць па Нёмане. Пяць першых малалітражных карабельчыкаў змогуць перавозіць турыстаў і гараджан. Першыя два прычалы з'явяцца ў горадзе, далей на базе адпачынку «Прывал» і ажно да самай мяжы з Літвой можна будзе пракаціцца па рачных хвалях.

— Упершыню Гродна запрашае бязвізавых турыстаў. Ці робіце на гэтым акцэнт?

— Гэта свята нацыянальных культур, і турысты да нас прыязджаюць на працягу года. Мы бачым статыстыку — у асноўным гэта прадстаўнікі 20 краін свету. Калі паглядзець на ўдзельнікаў фэсту, то гэтыя дыяспары і нацыянальнасці таксама ёсць у нашай краіне. Я лічу, што яны запросяць сваіх землякоў. Улічваючы, што пасля мінулага фестывалю пайшла дастаткова шырокая рэкламная дзейнасць, будзе шмат гасцей, да таго ж прыедуць дэлегацыі з нашых гарадоў-пабрацімаў...

— Інфраструктура дазволіць прыняць такую колькасць гасцей?

— Так, мы зможам гэта зрабіць: сёлета задзейнічаны ўсе дзіцячыя аздараўленчыя летнікі, інтэрнаты, санаторыі. І бачым добрую тэндэнцыю: у апошнія два гады адкрываецца шмат хостэлаў, невялікіх гатэляў. Таксама задзейнічаны кватэры, якія здаюцца пасутачна. У горадзе ёсць дастаткова нядрэнныя апартаменты, там будзе вельмі камфортна турыстам і гасцям.

Што датычыцца магчымасці падсілкавацца, практыка мінулага фестывалю паказала, што рэстаран пад адкрытым небам, дзе было створана 1500 месцаў, карыстаўся вялікім попытам. Цяпер гэты вопыт мы паўторым: на цэнтральнай плошчы горада — Леніна — арганізуем ужо каля дзвюх тысяч месцаў, каб можна было камфортна паглядзець канцэрт (на сцэнічнай пляцоўцы на працягу другога дня нон-стоп будзе ісці праграма), а таксама пачаставацца стравамі беларускай нацыянальнай кухні. І проста добра адпачыць.

Вольга АНУФРЫЕВА

■

АПОШНІЯ ШТРЫХІ ДЛЯ ГАЛОЎНАЙ АРЭНЫ

Да афіцыйнага адкрыцця мінскага стадыёна «Дынама» пасля рэканструкцыі застаюцца лічаныя дні

Будаўнікі ўносяць апошнія штрыхі, і неўзабаве новае аблічча легендарнага спартыўнага аб'екта будзе канчаткова сфарміраванае. Арганізацыйны камітэт Еўрапейскіх гульняў паведамляе, што нядаўна на галоўнай арэне і трэніровачным полі стадыёна была завершана ўкладка рулоннага газона, якая заняла прыкладна тыдзень.

Газон расійскай кампаніі з Валгаграда раскатвалі на падрыхтаваны дрэнаж літаральна «з колаў». Па сведчанні спецыялістаў, на трэніровачным полі ён ужо прыжыўся. Фактычна тое ж можна назіраць і на галоўнай арэне. Характэрна, што асноўнае і трэніровачнае палі стадыёна «Дынама» маюць аднолькавыя памеры — 105х68 м. Адзінае адрозненне ў колькасці бегавых дарожак: на асноўным іх 9, а на трэніровачным — 4.

Паколькі галоўная арэна Еўрапейскіх гульняў — 2019 акрамя афіцыйных цырымоній адкрыцця і закрыцця будзе прымаць лёгкаатлетычны турнір, арганізатары паклапаціліся і аб інфраструктуры для гэтых стартаў. Выступаць атлеты будуць на сінтэтычных бегавых дарожках італьянскай вытворчасці, выраблены фірмай Mondo. Менавіта гэтая кампанія з'яўляецца афіцыйным пастаўшчыком лёгкаатлетычнага абсталявання і інвентару для Алімпійскіх гульняў.

Узвышаюцца над стадыёнам і новыя мачты асвятлення, якія таксама ўжо гатовыя да работы. Зараз завяршаецца мантаж LED-панэляў па перыметры арэны. Два вялікія экраны таксама неўзабаве зоймуць вызначаныя для іх праектам рэканструкцыі месцы. Не выключана, што адной са славутасцяў стадыёна «Дынама» стане алімпійская чаша, у якой будзе гарэць агонь II Еўрапейскіх гульняў.

Умяшчальнасць стадыёна пасля рэканструкцыі складзе 22 246 гледачоў. Спартыўны аб'ект на 70—80 % закрыты казырком. На трыбуне для прэсы змогуць размясціцца больш за 800 прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. Для работнікаў радыё і тэлебачання прадугледжаны 150 каментатарскіх кабінак.

У цэлым аб'ект знаходзіцца ў высокай ступені гатоўнасці, актыўна працягваецца добраўпарадкаванне яго тэрыторыі.

Адзначым, што першыя афіцыйныя спаборніцтвы на рэканструяваным стадыёне «Дынама» пройдуць 22 чэрвеня. Гэта будзе міжнародны лёгкаатлетычны матч Беларусь — Балканскія краіны — Балтыйскія краіны і Украіна.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Помнік маршалу

У Гарадку днямі адкрылі помнік двойчы Герою Савецкага Саюза, маршалу Івану Хрыстафоравічу Баграмяну. Войскі першага Прыбалтыйскага фронту, якім ён камандаваў, вызвалялі гэту зямлю. Дарэчы, першую Зорку Героя Баграмян атрымаў у 1944 годзе за вызваленне Беларусі.

У ганаровай цырымоніі адкрыцця помніка ўдзельнічалі яго нашчадкі. У прыватнасці, унук і поўны цёзка Іван Баграмян. У райцэнтр у гэты дзень таксама прыехалі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Арменія ў Беларусі Алег Есаян, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў, старшыня Рэспубліканскай камісіі па ўвекавечанні памяці загінулых, ахвяр і абаронцаў Айчыны Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Сяргей Азаронак і іншыя.

Помнік знаходзіцца ў маляўнічым скверы ў пачатку вуліцы, якая носіць імя Баграмяна. Ініцыятарам увекавечання памяці маршала стаў Фонд развіцця і падтрымкі армяназнаўчых даследаванняў «АНІЎ» (у перакладзе — «кола»).

Як падкрэсліў **старшыня Гарадоцкага раённага выканаўчага камітэта Пётр КАРАБАЧ,** адкрыццё помніка — важная падзея для горада. Ён будзе спрыяць ваенна-патрыятычнаму выхаванню тутэйшай моладзі.

Спецыяльна да адкрыцця помніка герою ў горадзе арганізавалі святочны канцэрт, а таксама экспазіцыю раённага музея баявой славы і тэматычную выстаўку «Палкаводцы Вялікай Перамогі». Яна спецыяльна была падрыхтавана Дзяржаўным музеем ваеннай гісторыі Рэспублікі Беларусь да 120-годдзя з дня нараджэння маршала.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ВЫБУХ У БУДЫНКУ Ў МІНСКІМ РАЁНЕ

Учора ў 8.55 ратавальнікам паступіла паведамленне аб выбуху ў адміністрацыйна-вытворчым будынку на вуліцы Лясной у вёсцы Каралёў Стан Мінскага раёна.

Па інфармацыі МНС, калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні, высветлілася, што ў будынку па вытворчасці бітумнай гідраізаляцыі плошчай 2400 квадратных метраў адбыўся выбух з наступным гарэннем.

У 9.18 пажарныя лакалізавалі пажар. Напачатку паведамлялася, што траўмаваны тры чалавекі. Супрацоўнікі МНС працягвалі работы па ліквідацыі пажару. У 10.09 з'явілася абноўленая інфармацыя: ён ліквідаваны, пацярпелі чатыры чалавекі, іх шпіталізавалі.

Прэс-служба Міністэрства аховы здароўя паведаміла, што грамадзяне атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці. Усіх іх даставілі ў гарадскую клінічную бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі сталіцы. Два пацыенты трапілі ў цяжкім стане ў апёкавую рэанімацыю, у аднаго пацярпелага траўмы сярэдняй ступені цяжкасці, яшчэ ў аднаго — лёгкай.

На месцы здарэння цягам учарашняга дня працавала следча-аператыўная група.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗМАГАЛІСЯ ЗА ЖЫЦЦЁ ДВА ТЫДНІ

У Брэсцкай абласной бальніцы памерла 10-гадовая дзяўчынка, якая пацярпела 9 мая падчас урагану.

Вечарам школьніца з сяброўкамі пайшла гуляць у парк, дзе было шмат людзей. А каля 17 гадзін наляцеў моцны вецер, які зламаў дрэва. Вялікая галіна ўпала на гандлёвую палатку і пешаходную дарожку. На бяду, у той жа момант побач аказалася дзяўчынка. Амаль два тыдні ўрачы змагаліся за яе жыццё. Але выратаваць дзіця не ўдалося.

Пасля гэтага выпадку ў Брэсце пачалося паўторнае абследаванне дрэў. Там, дзе яны могуць несці небяспеку, іх спілуюць. А ў месцах масавага адпачынку людзей напярэдадні мерапрыемстваў дрэвы будуць аглядаць дадаткова.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ВЕЛАСІПЕД СХАВАЎ ЗА «ТАЛЕРКАЙ»

Зладзюжкам быў сусед па доме

У Маскоўскі РУУС сталіцы з заявай звярнуўся мінчанін: у яго з тамбура пад'езда зніклі веласіпед і бегавел агульным коштам 250 рублёў.

Фота БелТА

Першы не быў закрыты на замок, і зламыснік без цяжкасцяў украў яго.

Міліцыянеры ўстанавілі, што гэта — справа рук жыхара гэтага ж дома. Падчас паквартэрнага абходу аператыўнік звярнуў увагу на падазронага жыльца другога паверха. Мужчына паведаміў міліцыянеру, што толькі што выкідваў смецце і каля смеццеправода ўбачыў пакінуты некім бегавел. Скрадзеная маёмасць сапраўды знаходзілася ва ўказаным месцы. Калі праваахоўнік вярнуўся да грамадзяніна, каб апытаць яго, то заўважыў, што мужчына трымае ў руках пакет са смеццем, які быццам бы нядаўна выкінуў. Аператыўнік западозрыў, што грамадзянін датычны да крадзяжу. Скрадзены веласіпед быў знойдзены схаваным за спадарожнікавай антэнай-«талеркай», якая была прымацавана да фасада дома. Мінчанін 1979 года нараджэння не працуе, раней да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся. Яго датычнасць да злачынства пацвердзіла экспертыза.

РЫБАЧЫЛІ СЕТКАМІ Ў МЕЖАХ ГОРАДА

Двух жыхароў Стоўбцаў затрымалі дзяржінспектары на гарадскім возеры ўначы. Мужчыны знялі тры сеткі, у якіх былі 22 кілаграмы рыбы (34 асобіны).

За ляшчоў і карасёў, вылаўленых забароненымі прыладамі ў перыяд нерасту, рыбакам-нелегалам прыйдзецца заплаціць больш за 5 тысяч рублёў, ім пагражае крымінальная адказнасць, паведамілі ў Дзяржінспекцыі.

З дзвюма сеткамі выйшаў на незаконны промысел бабруйчанін — лавіў ледзьве не каля самай набярэжнай Бярэзіны. Пры затрыманні парушальнік аказаў непадпарадкаванне работніку Бабруйскай міжрайінспекцыі. У дачыненні да яго ўжо заведзена крымінальная справа. 15 кілаграмаў рыбы (61 асобіна) абыдуцца браканьеру амаль у 6 тысяч рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МАЙСТАР СПРАВЫ НЕ БАІЦЦА!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Свіная карэйка з бульбяным пюрэ і яблычна-тмінавым соусам на падушцы з рататуя з гародніны, дэкарыраваная мікразелянінай. Араматная свініна ў соусе на квасе з пюрэ з бульбы і лукавым мармеладам... Вы толькі не падумайце, што гэта рэклама меню элітных рэстаранаў. Такія стравы гатавалі ўчора ўдзельнікі **Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus 2018 года,** — навучэнцы каледжаў і Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання. На два дні Футбольны манеж у сталіцы і спартыўна-забаўляльны комплекс Falcon Club ператварыліся ў вітрыну прафесій. Тут былі прадстаўлены 37 кампетэнцый: ад творчых прафесій і моды да сталярных і плотніцкіх работ, кірпічнай кладкі і вытворчасці мэблі. Намаганні 320 канкурсантаў ацэньваюць каля 300 экспертаў, сярод іх — акрэдытаваныя эксперты WorldSkills International, якія ведаюць міжнародныя стандарты і рэгламенты WSI.

— Ступень складанасці заданняў на сусветным першынстве расце ад чэмпіянату да чэмпіянату, — тлумачыць **галоўны эксперт у кампетэнцыі «Кулінарнае майстэрства», прарэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Вольга МАЦЫКАВА.** — На міжнародных конкурсах удзельнікам прапануюць прыгатаваць стравы, якія сталі класікай міжнароднай кухні, таму цалкам браць адтуль заданні мы не бачым сэнсу — нам важна развіваць сваю нацыянальную кухню, робячы стаўку на ўязны турызм. У першы дзень канкурсантаў чакаюць чатыры модулі. Яны павінны прыгатаваць закуску з буракоў, булён з калдунамі, гарачую страву са свініны і дэсерт, у склад якога ўваходзіць мус з ягад плюс абавязковы дэкаратыўны элемент — ізамальт.

На другі дзень нашы майстры павінны прадставіць на суд журы гарачую фрэш-пасту ручной работы, страву з птушкі і дэсерт. Толькі фуршэтных закусак яны гатуюць тры віды па 15 штук. На 70 працэнтаў заданні вядомыя загадзя, а 30 працэнтаў — гэта, так бы мовіць, сюрпрыз, каб мы маглі ацаніць, наколькі канкурсант здольны дзейнічаць ва ўмовах, якія змяніліся, бо навучыць жа ўсяму немагчыма. Ну, напрыклад, яны ведалі, што ім давядзецца рыхтаваць гарачую страву са свініны, але якая частка ім дастанецца (карэйка, тазасцегнавая ці выразка), даведаліся толькі напярэдадні старту. З якіх ягад давядзецца рыхтаваць мус, таксама было загадкай. Давялося «чараваць» над чарніцамі. Заўважу, што эксперты ацэньваюць шмат фактараў: наколькі захоўваецца таварнае суседства ў халадзільніку, ці правільна канкурсанты працуюць з нажом, іх тэхніку і фантазію, валоданне сучаснымі тэхналогіямі. А дэгустуюць стравы незалежныя эксперты: рэстаратары і шэф-кухары.

— А ў нас усе заданні — сюрпрыз для канкурсантаў, — усміхаецца **галоўны эксперт у кампетэнцыі «Аўтамабільныя тэхналогіі», загадчык лабараторыі філіяла РІПА «Мінскі дзяржаўны аўтамеханічны каледж» Алег ЦАРУК.** — Напрыклад, у сістэму кіравання рухавіком мы ўнеслі 15 няспраўнасцяў. Задача канкурсанта за тры гадзіны дыягностыкі знайсці як мага больш няспраўнасцяў, а ў ідэале — усе. Чым больш іх ён выявіць, тым больш балаў атрымае. Другі модуль — электраабсталяванне: сістэма асвятлення, гукавой сігналізацыі, шкло-ачышчальнікі, шклопад'ёмнік... Сюды таксама ўнесены няспраўнасці. Трэба іх дыягнаставаць і ліквідаваць. І трэці модуль — механічная частка. Трэба правесці разборку і дыягностыку рухавіка, знайсці і ліквідаваць няспраўнасці, правесці рэгуліроўку і зборку.

Кампетэнцыя «Малярныя і дэкаратыўныя работы» ўключае наступныя заданні: афарбоўванне дзвярэй і налічніка, выкананне жорсткай фрэскі (сценапіс), паклейка вінілавымі шпалерамі са складаным малюнкам, змяшэнне і гарманізацыя колераў, афарбоўванне на хуткасць, дызайн і свабодная тэхніка, калі канкурсант выконвае дэкаратыўны элемент без выкарыстання сродкаў механізацыі, уручную, — інструменты і матэрыялы ён выбірае сам. Эскіз перадаецца журы да пачатку спаборніцтваў.

— На апошнім чэмпіянаце свету ў Абу-Дабі ў нашай кампетэнцыі, напрыклад, увялі афарбоўванне дзвярэй беспаветраным распыленнем, — расказвае **галоўны эксперт, начальнік упраўлення продажаў ЧУП «МАВ» Аляксандр РАДЗЮКОЎ.** — У нас пакуль ніводная навучальная ўстанова не можа дазволіць сабе набыць такую ўстаноўку, каб рыхтаваць рабочых. Але ў будаўнічых арганізацыях такое абсталяванне ўжо ёсць. Між іншым, тое, што маляр раней рабіў за некалькі дзён, цяпер ён можа зрабіць за адзін. Маляр — гэта не толькі работа з валікам, як многія думаюць. І гэта мы імкнёмся на чэмпіянаце ўсім прадэманстраваць. За мяжой увогуле няма маляра, а ёсць маляр-дэкаратар. Напрыклад, жорсткая фрэска (сценапіс) — гэта работа мастацкімі пэндзлямі, прычым канкурсантам забараняецца выкарыстоўваць малярную стужку. Работа вельмі відовішчная. Улічваючы, што ў нас зараз падаюць аб'ёмы будаўніцтва, я лічу, што за дэкаратыўнай спецыялізацыяй маляроў будучыня. Гэта яшчэ і магчымасць перайсці на самазанятасць, выконваць прыватныя заказы...

Адной з самых відовішчных стала кампетэнцыя «Прыкладная эстэтыка». Сярод конкурсных выпрабаванняў — спадагляд твару і цела, масаж, спа-манікюр і спа-педыкюр, афарбоўванне броваў і вееж, вячэрні макіяж, французскі манікюр, фантазійны макіяж з элементамі бодзі-арту ў зоне дэкальтэ і іншыя. Высвятляецца, што па міжнародных стандартах, спецыяліст па прыкладной эстэтыцы павінен валодаць навыкамі касметолага, спа-спецыяліста, майстра па манікюры, педыкюры і візажыста. Такіх універсальных спецыялістаў у нас не рыхтуюць. Сярод канкурсантаў ёсць як школьніца з Маладзечна, якая асвойвала майстэрства ў Навучальным цэнтры падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў эстэтыкі і масажу, так і студэнт Гомельскага медуніверсітэта (хлопец плануе стаць дэрматолагам-касметолагам). Ёсць дзяўчына, якая навучаецца на біёлага, і медсястра, якая зараз працуе адміністратарам у салоне прыгажосці. У гэту прафесію трапляюць самымі рознымі шляхамі.

Увогуле для моладзі важна ўдзельнічаць у падобных спаборніцтвах і атрымліваць узнагароды. Але яшчэ больш важна, што, вяртаючыся ў свае навучальныя ўстановы, на вытворчасць, у свае кампаніі, яны прыносяць туды самую апошнюю інфармацыю аб тым, як можна ўдасканальваць прафесійнае майстэрства. Сапраўдны прыз для ўдзельніка чэмпіянату — гэта новы змест падрыхтоўкі і інавацыйныя навыкі, якія істотна апярэджваюць час. Усё гэта дае ім шанцы на лепшае працаўладкаванне і хуткі кар'ерны рост.

Трэба дадаць, што да арганізацыі Рэспубліканскага конкурсу прафмайстэрства прыклалі намаганні многія айчынныя дзяржаўныя і прыватныя кампаніі, абсталяваўшы пляцоўкі, прадаставіўшы інструменты і матэрыялы. Дапамогу аказалі Мінскі трактарны завод, «Інтэграл», кампанія «МАВ», «БелДжы», «Амкадор», Knauf, Festo, Bosh і многія іншыя.

Сёння — другі дзень спаборніцтваў. Наведаць іх могуць усе ахвотныя. Уваход свабодны. Пераможцаў аб'явяць 24 мая. Яны прадставяць нашу краіну ў наступным годзе на сусветным чэмпіянаце, які пройдзе ў Казані.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота слова

«Амерыканская поп-спявачка Беёнсэ ў Новым Арлеане набыла для сябе царкву». (З паведамленняў СМІ ў апошнія дні мая 2018 года.)

— А ты набыў сабе царкву?
Тады спяшайся, бо раскупяць!
Усе зямляне помніць мусяць,
Што пра страшэнны суд не хлусяць,
Дарма не дураць галаву...
Дарэчы, выпадак не рэдкі —
Купляюць храмы, суддзяў, сведкаў,
І тэлешоу і газеткі —
Каб зручна скрыць грашкі свае.
І хтось багата зарабляе —
Прадаючы білет да Раю,
Сам на зямлі ў раі жыве.
А я прыгадваю бабулю
З маленькай вёсачкі, адкуль я
Ў маленстве бегаў да ракі.
Яна усім казала ў скрусе:
— Пайду ў царкву ды памалюся
Пра ўсіх людзей, за іх грахі...
Калі існуе рай гасподзен,
То там мая бабуля ходзіць
Сярод вяргіняў і лілей.
Яна за нас усіх маліла
І пешкам у царкву хадзіла
Сярод бязлітасных завей.

Прызначаны цягнікі на «Славянскі базар»

Беларуская чыгунка на час правядзення XXVII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар» прызначыла цягнік міжрэгіянальных ліній № 644/643 Мінск — Віцебск.

Расклад руху цягніка складзены з улікам праграмы правядзення фестывалю. Ён будзе курсіраваць штодня з Мінска з 9 па 18 ліпеня, а з Віцебска з 10 па 19 ліпеня, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі. Час адпраўлення цягніка са станцыі Мінск-Пасажырскі — 12.32, а прыбыцця ў Віцебск — 16.14.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ У лічбавым фармаце

УЖЫТКОВЫ ХАРАКТАР

Што зменіцца ў нашым жыцці пасля «ТІБО»

Робаты, дапоўненая рэальнасць, беспілотнікі і VR-касцюм, які пераносіць людзей унутр гульні. У сталіцы завяршылася міжнародная выстаўка «ТІБО», але ўражанні застануцца яшчэ надоўга. Айчынныя кампаніі прадставілі новыя тэхналогіі і паслугі, якія павінны палепшыць жыццё беларусаў. Некаторыя з іх з'явяцца ў краіне ўжо ў найбліжэйшы час. Пра тое, як робаты змогуць замяніць кіёскі для продажу білетаў, а пошту будуць дастаўляць беспілотнікі, мы і раскажам падрабязней.

ТЭРМІНАЛ ЗАМЕСТ КІЁСКАЎ

У Мінску ў хуткім часе могуць з'явіцца тэрміналы па продажы талонаў на ўсе віды транспарту з магчымасцю папаўнення праязных. Новую распрацоўку на «ТІБО» прадэманстравалі прадстаўнікі «Мінсктранса». У ім можна будзе набыць білеты і папоўніць смарт-карты, аднак толькі з дапамогай банкаўскай карты — робат-прадавец не будзе прымаць наяўныя грошы. Ён таксама абсталяваны супрацьвандальнай пратэкцыяй і абароненым дысплэем. Інтэрфейс экрана ў тэставым рэжыме працуе на чатырох мовах: беларускай, рускай, кітайскай і англійскай.

Як адзначылі супрацоўнікі кампаніі, якія знаходзіліся на стэндзе выстаўкі «ТІБО», зараз тэрміналы праходзяць сертыфікацыю. Да жніўня чатыры тэрміналы плануюць устанавіць у тэставым рэжыме на ажыўленых прыпынках сталіцы. Адно з такіх месцаў, хутчэй за ўсё, будзе на Нямізе.

Тэрміналы будуць тэставаць да вясны наступнага года. Важна для заказчыка праверыць іх працаздольнасць у зімовых умовах. Калі апараты прыжывуцца, то праз год іх стане значна больш і ў некаторых месцах знікне неабходнасць у кіёсках па продажы білетаў на праезд.

БЕЗ ЛІШНІХ ПАПЕР

«Белпошта» на «ТІБО» прадставіла прымяненне электронна-лічбавага подпісу, які кампанія распрацавала сумесна з МТС. Дзякуючы спецыяльнай SIM-карце, якая будзе даступная ў хуткім часе, можна будзе стварыць персанальны ўліковы запіс на сайце «Белпошты». Запіс змесціць усе персанальныя пашпартныя даныя, якія патрабуюцца пры ідэнтыфікацыі кліента. Такім чынам карыстальнік зможа забраць пасылку без наяўнага пашпарта на руках, а толькі маючы пры сабе смартфон. Кліенту павінна прыйсці паведамленне аб наяўнасці пасылкі і яшчэ адно паведамленне, у якое трэба ўвесці пін-код. Такім чынам афармляецца электронны дакумент, што дазваляе забраць пасылку без дадатковых аперацый.

Таксама можна будзе атрымліваць заказныя лісты ў электронным выглядзе. Гэта новая паслуга «Белпошты», якая дазволіць праглядаць адсканаваную карэспандэнцыю ў сваім кабінеце анлайн. З вашай згоды вам падключаць такую паслугу і вашы лісты будуць ускрывацца і сканавацца. Пры гэтым кампанія будзе забяспечваць канфідэнцыяльнасць згодна з усімі дамоўленасцямі. Чакаецца, што гэтыя паслугі можна будзе атрымліваць ужо ў наступным годзе.

Акрамя таго, па словах **начальніка цэнтра развіцця інфармацыйных тэхналогій «Белпошты» Анатоля НЕЎМЯРЖЫЦКАГА,** кампанія сёння працуе над магчымасцю дастаўкі пасылак з дапамогай дронаў. Пры гэтым, каментуючы сумны вопыт першага запуску такой паслугі «Поштай Расіі», ён адзначыў, што тады не было ўлічана мноства момантаў і не варта было запускаць тэставую сістэму ў вялікім горадзе.

«Ёсць меркаванне, што гэтыя сістэмы поўнамаштабна не будуць працаваць, пакуль не будзе створана пэўная наземная структура для кіравання беспілотнікамі. Наш робат-паштальён пакуль таксама з'яўляецца прататыпам, хоць і працуе. Мы будзем спрабаваць запусціць яго на працягу месяца ў Віцебскай вобласці, у сельскай мясцовасці з невялікім патокам адпраўленняў, дзе можна будзе рэальна замяніць паштовую машыну падобнай прыладай», — растлумачыў Анатоль Неўмяржыцкі.

Робат зможа пераносіць грузы да 5 кг. Калі выпрабаванні пройдуць паспяхова, спатрэбіцца яшчэ нямала працы для таго, каб прымяняць такую дастаўку ў вялікіх гарадах.

БУДУЧЫНЯ БЕСПІЛОТНІКАЎ

Але не толькі для дастаўкі грузаў у нашай краіне можна выкарыстоўваць беспілотнікі. Як адзначыў **член савета Беларускай федэрацыі беспілотнай авіяцыі Андрэй ЮШКОЎ,** арганізацыя сёння працуе над тым, каб данесці да дзяржорганаў, што электронныя механізмы можна выкарыстоўваць шырэй.



«Мы дапамагаем дзяржаве правільна ўнесці іх у прававое поле, каб на іх можна было бяспечна лятаць», — дадаў Андрэй Юшкоў. Калі 10 гадоў таму такія апараты былі чымсьці фантастычным як па ідэі прымянення, так і па кошце, то сёння яны ператвараюцца ў папулярнае хобі. Прычым хобі гэта нельга назваць дарагім. Сёння квадракоптар можна купіць і за 50 рублёў, і за 50 тысяч. У залежнасці ад задач, вядома ж.

Так, на выстаўцы федэрацыя паказала адзіны ў Беларусі аграбеспілотнік коштам каля 30 тысяч долараў, аналагі якога паліваюць пасевы і ўносяць пестыцыды на сельскагаспадарчых угоддзях Кітая. Для беларускіх фермераў пакуль такія дроны вельмі дарагія. Але лясныя гаспадаркі ўжо карыстаюцца імі. Прыкладна 20 гаспадарак выкарыстоўваюць дроны для абследавання лясных масіваў. У 2018 годзе каля 72 лясгасаў збіраюцца набыць дроны. Дарэчы, сёння ў Беларусі ўжо выкарыстоўваюць беспілотнікі для замеру радыяцыйнага выпраменьвання, для назірання за пацярпелымі ад чарнобыльскай трагедыі землямі. У краіне таксама ажыццяўляецца маніторынг межаў і рэжымных аб'ектаў з дапамогай беспілотнікаў. З кожным годам колькасць карыстальнікаў расце ў геаметрычнай прагрэсіі. У будучыні іх колькасць і сферы прымянення будуць толькі павялічвацца.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

КЛАКСАН

А ХТО ТАМ ІДЗЕ?

Каго выратаваць — кіроўцу або пешахода — рашэнне за штучным інтэлектам

Уявім сітуацыю: у беспілотнага аўтамабіля адмовілі тармазы, ён рухаецца, хоць на святлафоры гарыць чырвонае святло. Калі ён працягне рух, то саб'е дзяўчынку, якая пераходзіць дарогу па пешаходным пераходзе, калі сыдзе ў суседнюю свабодную паласу — саб'е іншага чалавека, напрыклад старога. Вядома, ёсць яшчэ адзін варыянт: з'ехаць на абочыну, дзе пасажыраў самога аўто можа чакаць слуп. І тут узнікае пытанне: што ў падобных выпадках павінен зрабіць штучны інтэлект?

Можна запярэчыць: так, сітуацыя няпростая, і рашэнне, пры якім у любым выпадку хтосьці можа пацярпець, адназначна прыняць немагчыма, але ж гэта толькі гіпатэтычная задача.

На жаль, усё стала рэальнасцю, калі некалькі гадоў таму ў ЗША з-за памылкі аўтапілота ўпершыню загінуў чалавек. Ні мужчына-кіроўца, ні штучны інтэлект аўтамабіля Tesla на фоне яркага неба не заўважылі белую фуру, якая выехала напярэймы. Машына з разгону трапіла пад прычэп грузавіка — і такая сітуацыя стала фатальнай.

Аўтапілот у асабістых аўтамабілях на сённяшні дзень даступны толькі вельмі забяспечаным кіроўцам, таму такія здарэнні ўсё ж адзінкавыя. Іншая справа, што цяпер актыўна распрацоўваюцца беспілотныя аўтамабілі таксі, якія ў тэставым рэжыме перавозяць пасажыраў. І тут таксама не абышлося без трагедый: у сакавіку бягучага года ў ЗША адбылося ДТЗ з беспілотнікам Uber, у выніку якога ўпершыню загінуў пешаход. Жанчына з веласіпедам пераходзіла дарогу ў неналежным месцы ў цёмны час сутак, траса была слаба асветлена, таму сутыкненне скончылася смерцю. Вінаватай была прызнана сама загінулая.

А днямі аб гэтым здарэнні з'явілася новая інфармацыя. Як паведаміла выданне The Information, аўтамабіль, які збіў жанчыну, «бачыў» яе пры дапамозе сваіх пярэдніх камер і сістэмы, якая вызначае адлегласць, — лідар. І тым не менш беспілотнік не палічыў з'яўленне жанчыны прычынай для спынення.

Чаму? Інфармацыя кампаніі такая: звычайна сістэму, якая адказвае за логіку распазнавання аб'ектаў, наладжваюць так, каб яна «не палохалася» нечаканых аб'ектаў, напрыклад прыпаркаваных каля дарогі аўтамабіляў. Аднак у дадзеным выпадку прычынай спынення не стала нават веласіпедыстка — аўто папросту праігнаравала яе. Вось і ўсё тлумачэнне.

Пасля гэтага Uber спыніў выпрабаванні беспілотнікаў, але ў хуткім часе — калі будзе апублікавана справаздача Савета нацыянальнай бяспекі руху — выпрабаванні адновяць.

І тут ёсць некалькі пытанняў. Вядома, беспілотнік «заточаны» пад ідэальнае выкананне правілаў дарожнага руху, аднак на дарозе прысутнічаюць не толькі аўтамабілі, але і сам чалавек. А як адаптаваць штучны інтэлект беспілотніка, напрыклад, да кіроўцаў-хамаў, якія перасякаюць дарогу на забаронены сігнал святлафора, падразаюць і здольныя на неадэкватныя ўчынкі? Як беспілотнікі будуць спраўляцца з дрэннымі ўмовамі дарог і надвор'я? Скажам, снег можа перашкодзіць счытваць разметку, а на некаторых дарогах яе можа быць і зусім не відаць нават у добрае надвор'е.

Занадта шмат аспектаў, якія адназначна вырашыць не ўдаецца, ды і адказы вытворцаў даволі агульныя, а цана за падобныя выпрабаванні можа быць занадта высокая, як у выпадку з жанчынай-веласіпедысткай. Зразумела, што тады вінавата была загінулая, але — гэта вельмі важна! — машына тармазіць не стала.

Усе вышэйназваныя праблемы мы папрасілі пракаментаваць кампанію «Яндэкс.Таксі», у мінскім офісе якой працуюць над аўтапілотам. Нам адказаў **Раман УДАВІЧЭНКА, кіраўнік групы распрацоўкі беспілотнага аўтамабіля ў «Яндэкс.Таксі»:**

«На ўсе гэтыя пытанні адказ пакуль агульны. Зразумела, усе апісаныя сітуацыі павінны і будуць улічвацца. Але галоўная задача зараз — стварыць тэхналогію, якая працуе, гэта значыць навучыць беспілотны аўтамабіль ездзіць у стандартных умовах. А далей можна пераходзіць да вырашэння больш складаных задач — і як ездзіць у магнітныя буры, і што рабіць з кіроўцамі-хамамі — і ўсіх астатніх. Пытанне пра «каго збіваць, калі адмовілі тармазы», здаецца, таксама не ўнікальнае для беспілотніка — гэта агульначалавечая гісторыя. Відавочна, што масавы выхад беспілотных аўтамабіляў на вуліцы гарадоў патрабуе перагляду рэгулявання і новых законаў ва ўсіх краінах свету. І рана ці позна чалавецтва вырашыць, што з гэтым рабіць. Гэтак жа ў свой час з'явіліся і конкі, і трамваі, і аўтамабілі, і іншыя віды транспарту: спачатку было незразумела, як з імі жыць, але хутка яны сталі масавымі.

Ці з'явіцца паўнавартасны горад-палігон для беспілотнікаў у Беларусі? Мы не вельмі любім дзяліцца планамі — лічым за лепшае расказваць пра тое, што ўжо адбылося. Наконт палігона ў Беларусі — паглядзім».

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

■ Форум

ІНАВАЦЫІ. ІНВЕСТЫЦЫІ. ПЕРСПЕКТЫВЫ

У Віцебску днямі адбыўся сёмы міжнародны інвестыцыйны тэматычны форум, які ўпершыню абраў пляцоўкай Летні амфітэатр, дзе традыцыйна праходзіць міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». І каля яго — на плошчы — размясціліся выставачныя павільёны.

Інтарэс павялічваецца

Віншуючы ўдзельнікаў і гасцей, **старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ** канстатаваў, што маштаб форуму і колькасць яго ўдзельнікаў павялічваюцца з кожным годам.

— Сёння ў мерапрыемстве прымаюць удзел 42 дэлегацыі з 14 краін свету. Віцебская вобласць з'яўляецца прамысловым рэгіёнам, які ўсебакова развіваецца. У нас больш за 1,5 тысячы малых, сярэдніх і буйных прадпрыемстваў, каля 30 тысяч прадпрымальніцкіх структур, якія прадстаўляюць бізнес больш як 40 дзяржаў, — адзначыў старшыня аблвыканкама.

Цікава, што недзяржаўныя прадпрыемствы засвоілі вытворчасць каля 70 % ад агульнай колькасці сілавога кабелю, які вырабляецца ў рэспубліцы, 20 % — упаковачных матэрыялаў з паліметаў. У Віцебску размешчаны адзіныя ў краіне недзяржаўныя вытворцы комплексных станцый водападрыхтоўкі і водаачысткі, тэлескапічных пад'ёмнікаў і так званых гідрабортаў. А ў Оршы — рукавоў высокага ціску. У Паставах летась запушчана ў эксплуатацыю першая ў краіне тэхналагічная лінія па вытворчасці паркету.

Доля інавацыйнай прадукцыі ў аб'ёмах прамысловай вытворчасці перавышае 30 % — гэта найлепшы паказчык у Беларусі.

Штогод прадпрыемствы вобласці экспартуюць прадукцыю ў амаль 90 краін на суму 2,5 мільярда долараў, і траціна ад яе — навукаёмістая і высокатэхналагічная. Толькі на Віцебшчыне ажыццяўляецца выраб акрылавых валокнаў, шкловалакна, ільняных тканін, даламітавай мукі.

На мяжы з ЕС і Расіяй

Што датычыцца перспектыў эканамічнага развіцця, то ў рэгіёне стаўку робяць на бізнес.

— Ён больш мабільны, і для яго развіцця ў краіне прыняты шэраг важных дакументаў, — канстатаваў губернатар.

Інвестараў можа зацікавіць і тое, што паўночная вобласць — адзіная ў Беларусі, якая адначасова мяжуе з краінамі Еўрапейскага саюза і з Расійскай Федэрацыяй.

Адпаведна, Прыдзвінскі край прапануе найбольш кароткі шлях для арганізацыі міжнароднага транзіту тавараў. Тут ёсць магчымасць стварэння сучаснай лагістычнай інфраструктуры, укаранення электронных схем гандлю. Дарэчы, у вобласці ёсць дзве пляцоўкі для арганізацыі комплекснай дастаўкі грузаў з выкарыстаннем авіяцыйнага, чыгуначнага і аўтамабільнага транспарту. Маюцца на ўвазе Віцебскі аэрапорт, размешчаны на міжнародных трасах на Маскву, Санкт-Пецярбург, Кіеў і Варшаву, і аэрадром у пасёлку Балбасава Аршанскага раёна. Вядома, што недалёка ад населенага пункта будуецца лагістычны комплекс. Ужо адведзена зямля і для пабудовы прамысловых прадпрыемстваў.

Мясцовыя распрацоўкі

У час форуму быў падпісаны шэраг дагавораў, пагадненняў аб наладжванні партнёрскіх адносін.

Напрыклад, дагавор аб супрацоўніцтве падпісалі Пекінская асацыяцыя малых і сярэдніх прадпрыемстваў і Віцебскае аддзяленне Беларускай гандлёва-прамысловай палаты. А нямецкая фірма і віцебскае таварыства «Малако» маюць намер рэалізаваць інвестыцыйны праект па ўзвядзенні кацельнай. Апошняя будзе працаваць на мясцовых відах паліва.

Акрамя таго, патэнцыйныя інвестары пазнаёміліся з распрацоўкамі беларускіх навукоўцаў.

Напрыклад, **дырэктар інкубатара малога прадпрымальніцтва ТАА «Прававая група «Закон і парадак» Міхаіл КЕЙЗЕРАЎ** паказаў прыборы, якія дапамагаюць больш эфектыўна весці сельскагаспадарчыя работы на зямлі. Скажам, кантраляваць унясенне угнаенняў. Прадэманстраваў таксама імпартазамяшчальны прэпарат, які дазваляе выявіць на ранніх стадыях рак. Па прыблізных падліках ён будзе танней за замежныя аналагі ў 1,5 раза. Уражвае і распрацоўка, якая дазваляе апынуцца ў віртуальным свеце. «Маска» з акулярамі і спецыяльныя праграмы ў ліку іншага дазваляюць рэабілітавацца паралізаваным. Сістэма выкарыстоўваецца і пры лячэнні псіхічных захворванняў.

Іншаземным бізнесменам прэзентавалі магчымасці экалагічнага турызму. Каля 40 % тэрыторыі вобласці займае лес, а колькасць рэк і азёр складае прыблізна 2,5 тысячы. Бізнесменам расказалі пра тое, што з улікам унікальнага прыроднага патэнцыялу распараджэннем Прэзідэнта ў шасці раёнах вобласці былі задзейнічаны льготныя ўмовы пры стварэнні інфраструктуры адпачынку. У прыватнасці, прадугледжваецца спрошчаны парадак выдзялення зямельных участкаў для будаўніцтва аб'ектаў турызму і аздараўлення.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Актуальна

Дапамагчы з працай, падтрымаць ініцыятыву

Мэта дэкрэта аб садзейнічанні занятасці — максімальна палепшыць сітуацыю на рынку працы, адзначыла міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ. Яна растлумачыла аспекты рэалізацыі дакумента на семінары ў Гомелі. Міністр падкрэсліла, што сумесная работа розных службаў, структур, ведамстваў дазволіць забяспечыць занятасць людзей і індывідуальны падыход да кожнага чалавека.

Ірына Касцевіч адзначыла, што сітуацыя на рынку працы паляпшаецца і гэтаму спрыяе як эканамічны рост, так і работа, што праводзіцца ў рэгіёнах па садзейнічанні занятасці. Так, узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Беларусі на 1 мая склаў 0,5 % да эканамічна актыўнага насельніцтва. Па Гомельскай вобласці ён на 0,1 % вышэйшы. У якасці беспрацоўных у паўднёва-ўсходнім рэгіёне зарэгістравана 3714 чалавек. Пры гэтым у банку вакансій на аднаго беспрацоўнага прыходзіцца 2,4 прапановы.

Кіраўнік ведамства праінфармавала, што да 1 снежня завершыцца стварэнне базы даных працаздольных грамадзян, не занятых у эканоміцы. Пілотную версію плануецца падрыхтаваць да 1 верасня. У далейшым база будзе актуалізавацца штоквартальна. Цяпер таксама завяршаецца фарміраванне складаў камісій па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва, рыхтуецца пералік цяжкіх жыццёвых сітуацый, якія будуць служыць падставай для выключэння з базы працаздольных грамадзян, не занятых у эканоміцы. Міністр заклікала ўдзельнікаў семінара падзяліцца і сваім досведам:

— Мы збяром з усёй краіны прыклады цяжкіх жыццёвых сітуацый, каб максімальна напоўніць пералік, — адзначыла Ірына Касцевіч. — Гэтыя рэкамендацыі будуць затым накіраваны камісіям для працы.

Фота БелТА.

Між тым у Гомелі на 1 мая 2018 года пры садзейнічанні ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама былі працаўладкаваны больш за 2,5 тысячы чалавек, у тым ліку 1,77 тысячы беспрацоўных. Па словах начальніка ўпраўлення Аляксандра Ключынскага, з гэтай мэтай рэгулярна праводзяцца кірмашы вакансій і дні прадпрыемстваў.

Адной з актыўных мер пры рэалізацыі дзяржпраграмы аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва на 2016—2020 гады з'яўляецца прафесійнае навучанне і павышэнне кваліфікацыі беспрацоўных. Ужо сёлета ў Гомелі больш за 300 чалавек былі накіраваны на навучанне.

— Для падрыхтоўкі кадраў, запатрабаваных у эканоміцы, створаны групы, у якіх арганізуецца навучанне сумесна з установамі адукацыі, — растлумачыў Аляксандр Ключынскі. — Адна з новых формаў садзейнічання занятасці насельніцтва, якая сёлета атрымала распаўсюджанне, — правядзенне інфармацыйных сустрэч сумесна з інспекцыяй МНС па Гомельскай вобласці. Спецыялісты ў тым ліку тлумачаць нормы Указа № 337 «Аб рэгуляванні дзейнасці фізічных асоб», якім пашыраны пералік відаў дзейнасці, дзе не патрэбна рэгістрацыя ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка.

Аляксандр Ключынскі падкрэсліў, што падтрымка дзелавой ініцыятывы грамадзян з'яўляецца адным з найважнейшых кірункаў палітыкі ў сферы садзейнічання занятасці насельніцтва. Так, на 1 мая гэтага года ў Гомелі субсідыі на арганізацыю прадпрымальніцкай дзейнасці выдзелены 38 беспрацоўным.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■ Ноу-хау

Альтэрнатыва раназажыўляльным гелям і мазям

Біялагічны сродак для хуткага гаення ран распрацавалі ў БДУ

Над праектам «Медыцынскі сродак для раназажыўлення на аснове нанакомплексаў цыкладэкстрыну з куркумінам» працуе калектыў навукова-даследчай лабараторыі прыкладных праблем біялогіі кафедры заалогіі біялагічнага факультэта.

Прэпарат вырабляецца ў форме парашку і прызначаны для аператыўнай апрацоўкі і планавай тэрапіі ран, атрыманых у выніку механічных пашкоджанняў, апёкаў, абмаражэнняў, трафічных язваў, «дыябетычнай ступні», пролежняў, незагойных скурных дэфектаў. Аналагаў яму ў еўрапейскіх краінах і краінах СНД не існуе. У лінейцы прадстаўленых на айчынным фармацэўтычным рынку раназажыўляльных прэпаратаў у форме геляў і мазяў актыўнымі кампанентамі выступаюць бялковыя кампаненты плазмы крыві буйной рагатай жывёлы. Прынцыповая навізна распрацоўкі навуковых супрацоўнікаў БДУ заключаецца ў тым, што асноўнае дзейнае рэчыва ў прэпараце — комплекс прыродных злучэнняў (куркуміноідаў), якія змяшчаюцца ў карэнішчы куркумы. Гэтыя біялагічна актыўныя рэчывы дапамагаюць забяспечыць устойлівасць клетак арганізма да акісляльнага фота- і тэрмаўздзеяння. Акрамя таго, форма распрацаванага медыцынскага сродку не выклікае алергічных рэакцый, не аказвае мясцовага раздражняльнага ўздзеяння.

Да пераваг інавацыі таксама трэба аднесці нізкую страту дзейнага кампанента ў выніку паглынання перавязачным матэрыялам у параўнанні з выкарыстаннем раназажыўляльных мазяў і геляў. Вытворчасць новага медыцынскага сродку — эканамічна выгадная, бо для яго выкарыстоўваюцца танная сыравіна і абсталяванне, якое ёсць на любым фармацэўтычным прадпрыемстве.

Ужо выпушчана доследная партыя і пададзена заяўка на патэнт. Акрамя таго, эфектыўнасць і перспектыўнасць распрацоўкі былі высока ацэненыя на конкурсе «Найлепшы інавацыйны праект і найлепшая навукова-тэхнічная распрацоўка года», які завяршыўся 22 сакавіка ў рамках XXIII Міжнароднай выстаўкі-кангрэса «Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі» (HI-TECH'2018) у Санкт-Пецярбургу. У паўночнай расійскай сталіцы праект навукоўцаў БДУ быў удастоены сярэбранага медаля.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Факт

ПАБУДАВАНА АМАЛЬ 13 ТЫСЯЧ КВАТЭР

За чатыры месяцы бягучага года ў нашай краіне ўведзена ў эксплуатацыю 1,147 млн квадратных метраў агульнай плошчы жылля. Такім чынам, арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 12,9 тысячы новых кватэр, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

У студзені — красавіку для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 415,3 тысячы «квадратаў» агульнай плошчы, або 36,2 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. З гэтага аб'ёму для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, з дзяржпадтрымкай пабудавана 281,8 тысячы квадратных метраў, у шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 256,4 тысячы «квадратаў». У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 330,9 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, што складае 28,8 % ад агульнага ўводу па краіне.

Сяргей КУРКАЧ.

ЛАГЕРЫ НАВОДЗЯЦЬ АПОШНІ ЛОСК

Фота БелТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кошт пуцёвак — немалаважнае пытанне для бацькоў, але не балючае для сямейнага бюджэту. Сёлета пуцёўка ў аздараўленчы лагер з кругласутачным прабываннем на 18 дзён будзе каштаваць у сярэднім 430 рублёў. Пры гэтым памер патанння — 185 рублёў. Аздараўленне ў лагеры з дзённым прабываннем абыдзецца ў сярэднім у 93 рублі, а памер патанння для гэтай катэгорыі — 76 рублёў. Дзевяць дзён у кругласутачным аздараўленчым лагеры каштуюць 100 рублёў з памерам патанння ў 75 рублёў. Кошт пуцёўкі ў лагер працы і адпачынку для старэйшых школьнікаў складае 100 рублёў пры памеры патанння ў 84 рублі, у спартыўны аздараўленчы лагер на 18 дзён — 460 рублёў пры памеры патанння ў 205 рублёў.

— Штогод памер датацыі складае каля 40 % ад агульнага кошту пуцёўкі, — адзначыла Ларыса Емяльянчык. — Таксама патанненне адбываецца за кошт прафсаюзнага ці прафсаюзнай арганізацыі, у выніку бацькі аплачваюць каля 10 %.

Самыя танныя, дарэчы, былі летась пуцёўкі ў летнікі Брэсцкай вобласці, а самыя дарагія — у сталічныя. Розніца ў кошце даходзіла да 120 рублёў.

Юных беларусаў сёлета чакаюць у 146 лагерах са стацыянарнай базай, якія адначасова могуць змясціць 27 тысяч дзяцей. Акрамя гэтага, арганізавана 1600 лагераў з кругласутачным прабываннем і 4293 лагеры з дзённым.

Ларыса Емяльянчык падкрэсліла, што сёння лагер — гэта месца не толькі прыемнага адпачынку і цікавых забаў, але і спосаб зарабіць. Старэйшыя школьнікі, дарэчы, у лагерах працы і адпачынку мелі магчымасць зарабіць мінулым летам да 200 рублёў.

Тым часам урачы-гігіеністы і іншыя спецыялісты ацэньваюць падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых устаноў да прыёму школьнікаў. Вядзецца падбор медыцынскага персаналу, кантралюецца наяўнасць лекаў.

— Аздараўленчы лагер — гэта не лячэбная ўстанова, і прызначаны ён для адпачынку дзяцей, якія ў гэты момант не хварэюць. Калі здараецца, што нехта захварэе, яго шпіталізуюць ці перадаюць бацькам. Мы кантралюем, каб усе лагеры мелі дагаворы на аказанне медыцынскай дапамогі, была магчымасць для пад'езду машыны хуткай дапамогі, — адзначыла **галоўны педыятр галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Валянціна ВАЛЧОК.** — Найчасцей у лагеры дзеці звяртаюцца з праблемамі, якія медыцынскі работнік у стане вырашыць на месцы, — з ранкамі і сінякамі, укусамі насякомых, алергіяй.

Загадчык аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА дадала, што ўспышак інфекцыйных хвароб летась падчас летняй аздараўленчай кампаніі ўдалося пазбегнуць. Тым часам было каля 140 выпадкаў захворвання на ветраную воспу і 66 выпадкаў укусаў кляшчамі.

Дзякуючы прадпісанням гігіеністаў у апошнія гады ўдалося дасягнуць значных поспехаў ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы лагераў. Пераважная большасць з іх забяспечана сістэмамі ацяплення, каналізацыі і гарачай вадой. Толькі два стацыянарных лагеры са 146 пакуль не маюць каналізацыі і пяць — ацяплення.

Пераважная большасць дзіцячых летнікаў у Брэсцкай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай абласцях будуць цалкам падрыхтаваны да 25 мая і адчыняць свае дзверы для наведвальнікаў з дазволу спецыяльных камісій пры райвыканкамах, якія кантралююць іх стан. Лагеры ў Гомельскай і Віцебскай абласцях традыцыйна адчыняюцца крыху пазней — з 10 чэрвеня.

Алена КРАВЕЦ.

❍ Магілёўшчына

З улікам сродкаў рэспубліканскага бюджэту сёлета на Магілёўшчыне плануецца аздаравіць 42 100 дзяцей, з іх — 17,5 тысячы ў лагерах з кругласутачным знаходжаннем. Да паслуг хлопчыкаў і дзяўчатак 20 загарадных аздараўленчых лагераў, тры з якіх — «Сосны», «Дубравенка» і «Свіслач» — створаны на базе санаторна-курортных арганізацый. Першыя заезды пачнуцца ўжо з 1 чэрвеня, а да 5-га запрацуюць усе дзіцячыя «базы адпачынку».

Дзяцей прымуць таксама профільныя 9-дзённыя лагеры, арганізаваныя ўстановамі адукацыі сумесна з абласнымі структурамі МНС, МУС, а таксама воінскімі часцямі. Для пераможцаў абласных і рэспубліканскіх алімпіяд прадугледжаны асобны летнік — «Алімпіец», у якім на працягу 18 дзён будуць адпачываць і практыкавацца ў сваіх ведах 100 падлеткаў.

— Аздараўленне дзяцей будзе весціся ў рамках рэспубліканскай акцыі «Лета — час адкрыццяў». Улічваючы, што гэты год прысвечаны малой радзіме, акцэнт плануецца зрабіць на вывучэнні роднага краю, яго турыстычнага патэнцыялу і выхаванні патрыятычнага пачуцця да роднай зямлі, — удакладнілі ва ўпраўленні адукацыі Магілёўскага аблвыканкама.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

❍ Віцебшчына

Тэма аздараўлення дзятвы традыцыйна ў цэнтры ўвагі мясцовай улады напярэдадні сезона работы летнікаў. І Прыдзвінскі край не выключэнне. У прыватнасці, пытанне фінансавання было агучана 17 мая на пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў.

Усяго ў Віцебскай вобласці для добраўпарадкавання летнікаў было запланавана выдаткаваць каля 960 тысяч рублёў.

Паводле інфармацыі Віцебскага абласнога ўпраўлення Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва, на гэтыя мэты накіраваны грошы з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў, а таксама — прадпрыемстваў, арганізацый, якім належаць аздараўленчыя лагеры.

Па папярэдніх планах прыкладна ў трыццаці кругласутачных летніках адпачнуць каля 16 тысяч дзяцей і падлеткаў. Да таго ж больш за 27 тысяч — у так званых прышкольных.

Вялікая ўвага ўдзяляецца і пытанням бяспекі. Традыцыйна адпаведныя рэйды праводзяць прадстаўнікі выратавальнай, санітарна-гігіенічнай і іншых службаў, праваахоўных органаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

❍ Гомельшчына

Гэтым летам на Гомельшчыне будзе працаваць 10 стацыянарных летнікаў у Гомельскім, Рэчыцкім, Светлагорскім раёнах.

Як расказала **начальнік аддзела выхаваўчай і сацыяльнай работы ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Ірына ДРАБЫШЭЎСКАЯ,** у межах абласной міжведамаснай праграмы па забеспячэнні занятасці дзяцей «Лета на карысць — 2018» на Гомельшчыне больш за 34 тысячы навучэнцаў плануецца ахапіць адпачынкам у аздараўленчых лагерах на базе ўстаноў адукацыі. Будзе працягнуты праект «Прафесійныя вакацыі», у межах якога на базе ўстаноў адукацыі будуць працаваць прафарыентацыйныя лагеры для навучэнцаў.

Традыцыйна спецыяльная ўвага ўдзяляецца арганізацыі часовай працоўнай занятасці школьнікаў. Так, плануецца адкрыць звыш 200 лагераў працы і адпачынку для 3,5 тысяч навучэнцаў. Дзеці будуць займацца рамонтам школьнай мэблі, вырабам стэндаў, добраўпарадкаваннем тэрыторыі, а таксама прымуць удзел ва ўборцы агародніны і садавіны.

Гэтым летам будуць таксама працаваць раённыя, гарадскія міжведамасныя летнікі для дзяцей розных катэгорый сумесна з падраздзяленнямі вайсковых часцей, пагрангрупамі, аддзеламі ўнутраных спраў і па надзвычайных сітуацыях, дзіцячымі і маладзёжнымі арганізацыямі...

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Фота БелТА.

ЯК ЛЕТАМ АДПАЧНУЦЬ ЮНЫЯ МІНЧАНЕ?

Свае дзверы першыя лагеры з дзённым знаходжаннем расчыняць ужо ў канцы мая. Так, «Спадарожнік», «На ростанях», «Зялёны бор», «Агеньчык» і «Крынічка» будуць працаваць у пяць змен. Сярэдняя працягласць змены — 18—21 дзень. Усяго ж сталічных школьнікаў гатовыя прыняць каля 660 лагераў: 32 загарадныя, больш за 400 на базе школ з дзённым знаходжаннем, каля 200 палатачных і 30 на арандаваных плошчах санаторна-курортных арганізацый.

Плануецца, што на працягу лета ў дзіцячых аздараўленчых лагерах адпачнуць каля 68 тысяч мінчан. Як расказаў **начальнік прадстаўніцтва Мінскага гарадскога ўпраўлення Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Валерый НАФРАНОВІЧ,** на падрыхтоўку ўстаноў да сезона было выдаткавана больш за 2,3 мільёна рублёў. Таксама на гэтыя патрэбы выдзелена частка сродкаў, зароблены на рэспубліканскім суботніку, аднак асвоены яны будуць ужо пасля заканчэння цяперашняга сезона. Упершыню для аздараўлення сталічных школьнікаў будзе выкарыстаны санаторый-прафілакторый БНТУ «Палітэхнік», ён зможа прыняць 240 дзяцей адначасова. Адкрылі яго на замену закрытаму «Чабарку».

У сярэднім кошт пуцёўкі на поўную змену складзе каля 505 рублёў, за 9 дзён у профільным лагеры — 128 рублёў, пры гэтым значная частка сродкаў будзе кампенсаваная за кошт дзяржавы. Дарэчы, разнастайнасць напрамкаў профільных лагераў як ніколі шырокая: у спартыўных, спартыўна-аздараўленчых, турыстычных, краязнаўчых, ваенна-патрыятычных лагерах адпачнуць 22 тысячы мінскіх школьнікаў. Так, на базе Цэнтра сацыяльнай рэабілітацыі дзяцей і інвалідаў «Расток» будзе ўжо не першы раз арганізаваны палатачны лагер «Патрыёт» ваенна-патрыятычнай накіраванасці для падлеткаў, якім неабходна сацыяльна-педагагічная ўвага. Знаходжанне ў ім цалкам фінансуецца з бюджэту. Вялікая ўвага будзе ўдзелена дзецям, якія маюць патрэбу ў падтрымцы дзяржавы. За бюджэтныя сродкі плануецца аздаравіць каля трох тысяч дзяцей-сірот, тых, якія знаходзяцца пад апекай, і дзяцей-інвалідаў.

Для тых, хто плануе зарабіць летам свае першыя грошы, у сталіцы будуць дзейнічаць лагеры працы і адпачынку. Усяго прадугледжана 1300 месцаў, запісацца змогуць падлеткі ад 14 да 18 гадоў. Асноўны тып работ — некваліфікаваная праца: уборка, праполка, фасоўка тавару, добраўпарадкаванне тэрыторыі і гэтак далей.

Валерый Нафрановіч падкрэсліў, што прыёмка летніх лагераў будзе завершана да 25 мая. Дарэчы, нягледзячы на тое, што пачатак сезона імкліва набліжаецца, яшчэ можна паспець адправіць дзіця на аздараўленне нават на першую змену: усе «гарачыя» пуцёўкі можна знайсці на сайце Мінгарвыканкама.

Дар'я КАСКО.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 3 (31)

■ Размова па сутнасці

ВЕДЫ, ЗАКОН І ЭКАЛОГІЯ

Мінск стаў пляцоўкай для зацікаўленага абмеркавання прыродаахоўных пытанняў

Сёння большасць экалагічных праблем вырашаецца сумеснымі намаганнямі розных краін, спецыялістамі ў розных сферах. Сусветная супольнасць прыйшла да такой практыкі, паколькі сёння відавочна, што сіламі толькі асобна ўзятай дзяржавы глабальныя пытанні вырашыць немагчыма. Менавіта з мэтай адукацыі, абмену вопытам, стварэння і прасоўвання міжнародных праграм у Мінску адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя «Сахараўскія чытанні 2018 года: экалагічныя праблемы XXI стагоддзя», у якой прынялі ўдзел больш за 500 прадстаўнікоў з Арменіі, Беларусі, Германіі, Грузіі, Казахстана, Малдовы, Польшчы, Расіі, Сербіі, Таджыкістана, Турцыі, Узбекістана, Украіны.

Міжнародная канферэнцыя прайшла ў Мінску пры падтрымцы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства адукацыі, Міністэрства аховы здароўя, Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Грамадскага савета Базавай арганізацыі па экалагічнай адукацыі краін СНД, Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў, Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі.

— Міжнароднае супрацоўніцтва спрыяе ўкараненню прынцыпаў устойлівага развіцця, — заявіў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХМЕЛЬ** падчас адкрыцця канферэнцыі. — Мы разумеем, што ўкараненне прынцыпаў устойлівага развіцця, прасоўванне экалагічных інавацый, гарантаванне экалагічнай бяспекі немагчымыя без цеснага міжнароднага супрацоўніцтва, прыцягнення замежных інвестараў. Таму мы актыўна выкарыстоўваем платформу міжнароднага ўзаемадзеяння для вырашэння прыродаахоўных задач, павышэння даступнасці экалагічных тэхналогій.

Ён падкрэсліў, што толькі экалагічна падрыхтаванае грамадства можа забяспечыць устойлівае развіццё дзяржавы, таму фарміраванне сістэмы бесперапыннай экалагічнай адукацыі, яе заканадаўчае ўдасканаленне, падрыхтоўка кадраў у галіне экалогіі з'яўляюцца напрамкамі дзейнасці Мінпрыроды ва ўзаемадзеянні з іншымі дзяржаўнымі структурамі і грамадскімі аб'яднаннямі.

— Падзеі, якія адбываюцца ў свеце, сацыяльна-эканамічныя працэсы і звязаныя з імі новыя рызыкі і выклікі, у тым ліку экалагічнага характару, прымушаюць нас шукаць найбольш эфектыўныя шляхі рэалізацыі экалагічнай палітыкі дзяржавы. Наглядным прыкладам такога новага падыходу да ўздзеяння на навакольнае асяроддзе стала ўкараненне прынцыпаў зялёнай эканомікі, якія забяспечваюць устойлівае развіццё, заснаванае на падтрыманні балансу эканамічнага росту, павышэнне якасці жыцця і захаванне прыроднага асяроддзя. У нашай краіне назапашаны немалы вопыт у гэтай сферы. Мы актыўна рэалізуем шэраг дзяржаўных і галіновых праграм экалагічнай накіраванасці, — адзначыў намеснік міністра.

Вадзім БОГУШ, на момант правядзення мерапрыемства **першы намеснік міністра адукацыі,** адзначыў: «Важнасць праблемы экалагічнай бяспекі

бясспрэчная, сведчаннем чаго з'яўляюцца шматлікія кангрэсы, пратаколы, пагадненні ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў. Канферэнцыя ў Мінску дазваляе спецыялістам розных краін абмяняцца вопытам у вырашэнні задач экалагічнай бяспекі, пазначыць актуальныя «болевыя» пункты ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, вызначыць прыярытэты для канцэнтрацыі намаганняў з мэтай прадухілення негатыўнага антрапагеннага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе і здароўе чалавека. Канферэнцыя за апошнія гады стала міжнародным форумам з шырокім прадстаўніцтвам, разнапланавай тэматыкай, якая праводзіцца ў галіне экалогіі і геаграфіі краін-удзельніц».

Падчас канферэнцыі былі праведзены пасяджэнні Грамадскага савета Базавай арганізацыі дзяржаў — удзельніц СНД па экалагічнай адукацыі, а таксама шэрагу секцый і круглых сталоў. У прыватнасці, у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу прайшоў круглы стол «Экалагічнае заканадаўства і фарміраванне светапогляду чалавека ў інтарэсах устойлівага развіцця».

Таццяна КАНАНЧУК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы, заявіла:

— Сёння любы законапраект (эканамічнай, сацыяльнай, экалагічнай накіраванасці) перш за ўсё арыентаваны на ўстойлівае развіццё. У цяперашні момант у нашай камісіі разглядаецца некалькі законапраектаў: аб асабліваахаваных прыродных тэрыторыях, аб унясенні змяненняў у Лясны кодэкс, аб радыяцыйнай бяспецы. У рамках правядзення круглага стала прыярытэт абмеркавання быў аддадзены радыяцыйнай бяспецы, таму што там прысутнічалі эксперты з Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў (РФ), з Інстытута радыяцыйнай бяспекі і экалогіі (Казахстан), наш дэпартамент па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы, дэпартамент па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Важны і міжнародны вопыт, таму што асноўныя палажэнні ў гэтым законапраекце — гэта абнаўленне прынцыпаў, асноў радыяцыйнай бяспекі з улікам міжнародных патрабаванняў, у тым ліку і патрабаванняў МАГАТЭ. Усе абнаўленні, якія прымаюцца ў новы законапраект, пачынаючы з тэрміналогіі (гэта датычыцца крыніц іанізавальнага выпраменьвання), прынцыпы, падыходы будуць разглядацца з улікам міжнародных патрабаванняў. Пытанні радыяцыйнай бяспекі павінны быць разгледжаны комплексна (экспертыза крыніц іанізавальнага выпраменьвання, якія яшчэ не ўведзены ў эксплуатацыю). Мы плануем поўнае абнаўленне законапраекта. Дакумент рыхтуецца да разгляду ў першым чытанні.

Вольга ПРАЛЮК

■ Ёсць пытанне

Дзікія жывёлы заходзяць у горад

Што іх цягне да людзей?

Фота Георгія ГУЛЕЎСКАГА.

Нядаўна ў Мінску адбыўся нетрывіяльны выпадак: лось зайшоў на тэрыторыю дзіцячага садка № 79 па вуліцы Галадзеда. Інфармацыю пра здарэнне далі супрацоўнікі Мінскага ГУ МНС, і навіна выклікала неадназначныя меркаванні ў грамадстве. Да месца знаходжання дзікай жывёлы хутка прыбылі супрацоўнікі розных ведамстваў і арганізацый, увялі ёй транквілізатар і аператыўна пагрузілі ў транспарт, але да месца, дзе сахатаму планавалася аказаць дапамогу («Фаўна горада»), лася не давезлі — жывёла загінула.

Дырэктар ГП «Фаўна горада» Тамара Царыкоўская сцвярджае, што смерць лася адбылася ад шматлікіх траўмаў, нанесеных жывёле, як мяркуецца, аўтамабілем. У яго былі траўмаваныя галава, пярэднія капыты, тулава. Паколькі лось важыў каля 350 кілаграмаў, можна з упэўненасцю сказаць, што гэта была маладая асобіна. Пасля таго як жывёла трапіла пад машыну, яна ў шокавым стане паспрабавала схавацца ў зацішным і зялёным месцы, такім і аказаўся ўчастак дзіцячага садка. Па словах загадчыцы ясляў-сада № 79 Наталлі Гунько, лось пераскочыў цераз агароджу, забіўся ў самы далёкі кут і ціха там ляжаў: яго нават не адразу заўважылі.

Што ж прымусіла дзікую траваедную жывёлу пакінуць лес і накіравацца проста да небяспекі? **Рыгор ЯНУТА, кандыдат біялагічных навук ДНВА «НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах», старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі папуляцыйнай экалогіі наземных пазваночных і кіравання біярэсурсамі,** кажа, што вясной у маладняку пачынаецца перыяд самастойнага жыцця, яны сыходзяць ад маці і застаюцца зусім адны. Жывёлы дэзарыентаваныя і могуць сысці даволі далёка ад месца свайго пражывання:

— Як правіла, у такія складаныя і небяспечныя сітуацыі трапляюць маладыя жывёлы і жывёлы-падлеткі, якіх адганяюць маці ў вяснова-летні перыяд. Асобіны другога года жыцця адыходзяць ад самкі, калі ёй пара мець новае маладое патомства. Маладыя жывёлы знаходзяцца ў лёгкім здзіўленні, не ведаюць, што рабіць. Інстынкт самазахавання ў іх не моцна развіты, а падтрымка дарослага ўжо адсутнічае, таму яны імкнуцца заняць бяспечныя, на іх думку, тэрыторыі. Варта звярнуць увагу на той факт, што праз Мінск ляжыць даволі вялікая колькасць міграцыйных шляхоў, жывёле нескладана зайсці ў горад. Як правіла, звяры выбіраюць перыферыю населенага пункта ў якасці сваёй новай тэрыторыі, прыходзяць туды ўночы, але з надыходам светлага часу сутак і пачаткам інтэнсіўнага руху на дарогах, з'яўленнем людзей на вуліцах яны спрабуюць забіцца ў якое-небудзь зацішнае месца (скверы, лесапаркавыя комплексы ці той жа дзіцячы сад у дварах).

— Як часта адбываюцца падобныя выпадкі?

— Такія здарэнні даволі рэдкія ў сталіцы, не часцей за адзін раз на 2-3 гады. Да гэтага выпадку падобны інцыдэнт быў толькі ў 2015 годзе: лось зайшоў у парк Чалюскінцаў і нейкі час там знаходзіўся, затым яго проста злавілі і адвезлі ў лес.

— Што трэба рабіць пры сустрэчы з дзікай жывёлай у горадзе?

— Трэба памятаць, што любая жывёла (траваедная або драпежная) можа праяўляць прыкметы агрэсіі, але, як правіла, маладыя жывёлы спрабуюць схавацца, знайсці зацішны куток. Пры сустрэчы з любой жывёлай рэкамендацыя такая: не падыходзіць да яе нават з улікам таго, што яна траваедная. Той жа лось уяўляе вялікую небяспеку для чалавека, паколькі мае значную масу цела (да 400—500, а ў дарослых асобін яна можа дасягаць і да 700 кілаграмаў) і з лёгкасцю можа прычыніць вам шкоду. Лепш за ўсё паведаміць у кампетэнтныя структуры, у арганізацыю «Фаўна горада» альбо ў санэпідстанцыю. Адзначу, што такія нетыповыя паводзіны часцей назіраюцца ў драпежнікаў з прыкметамі розных захворванняў, часцей шаленства (лісіца, янотападобны сабака, рысь). Капытныя не хварэюць на падобныя заразныя захворванні, але могуць быць паслабленыя ад іншай хваробы альбо ад паразітаў, таму могуць уяўляць не толькі фізічную пагрозу, але і пагрозу ў якасці пераносчыка небяспечнага захворвання.

Асноўных рэкамендацый усяго дзве: трымацца воддаль на адлегласці 200—300 метраў і аператыўна паведаміць у адпаведныя службы. Неабходна як мага хутчэй злавіць жывёлу і выпусціць у лес, каб ёй не ствараць дыскамфорту, таму што ў стане стрэсу жывёла можа нанесці шкоду як сабе, так і людзям.

Застаецца толькі звярнуцца да кіроўцаў розных транспартных сродкаў і папярэдзіць, што ў гэты перыяд трэба быць вельмі ўважлівымі падчас паездак па трасах уздоўж буйных лясных масіваў. Маладыя жывёлы могуць выходзіць на дарогу, і наступствы ад такой сустрэчы прадказаць цяжка.

Вольга ПРАЛЮК

■ Рэпартаж

Птушкі, ровар і прырода...

Як на тры гадзіны стаць велабёрдарам

Зусім нядаўна ў Мінску з'явілася ўнікальнае для Беларусі месца — «Горад птушак». Зараз там праходзіць шмат цікавых экскурсій пад кіраўніцтвам установы «Цэнтр экалагічнага выхавання і развіцця». Разам з імі мы адправіліся слухаць салаўёў, шукаць гнёзды рэмезаў і вучыцца распазнаваць птушак не толькі вонкава, але і па галасах. І ўсё гэта на роварах!

Руслан ШАЙКІН праводзіць інструктаж і расказвае, чым унікальны «Горад птушак».

Цяжка ўявіць, што каля Лошыцкага парку — акультуранага месца са скошанымі газонамі і падстрыжанымі дрэвамі — ёсць амаль некрануты чалавекам куточак дзікай прыроды — Сярэбраны лог. Менавіта тут і быў пабудаваны невялічкі птушыны гарадок (яго працягласць — каля 1,5 км), у якім можна сустрэць сотні розных відаў крылатых.

— Гэта месца ідэальна падыходзіць для экалагічнай адукацыі, бо мы можам назіраць за птушкамі, не перашкаджаючы ім. Тут з аднаго боку балота, а з другога — альховы гушчар, што не дае чалавеку ўклініцца ў жыццё птушак, як гэта адбылося з тым жа Лошыцкім паркам, — расказвае перад экскурсіяй **дырэктар Цэнтра экалагічнага выхавання і развіцця Руслан ШАЙКІН**.

Пакуль эксперт уводзіць нас у курс справы, каманда беларускіх велабёрдараў ужо збіраецца ў поўным складзе і з нецярпеннем чакае пачатку вандроўкі. Усяго нас дзесяць — аматараў птушак і роварaў. Аднак пачынаць экскурсію не спяшаюцца, трэба ж перад гэтым навучыцца карыстацца бінокламі, што, скажу я вам, не самая простая задача.

Пасля пяціхвілінnай трэніроўкі пад'язджаем да стартавага пункта нашай вандроўкі, дзе перад намі адчыняюцца дзверы ў сапраўдны птушыны горад. Каб не дахі шматпавярховак, якія віднеюцца з-пад дрэваў, цяжка было б паверыць, што гэта ўсё яшчэ Мінск. Тут няма асфальтаваных дарожак, прыгожых газонаў, лавак і іншых даброт цывілізацыі.

«Быццам у вёсцы», — выказвае агульнае ўражанне адзін з велабёрдараў.

Пра тое, што жыццё тут кіпіць, нам спявае салавей і крычаць вароны і гракі.

— Птушкі проста так не крычаць, значыць, дзесьці ястраб паблізу, — заўважае Руслан Шайкін, а мы ўсе прыслухоўваемся. — Вось чуеце: «фік-фік» — гэта салавей хвалюецца. І варонысамцы кружаць нездарма, яны падаюць сігнал сваім самкам — сядзець і не высоўвацца.

Праз некалькі хвілін мы знаёмімся яшчэ з адным жыхаром гарадка, а дакладней з яго гняздом. Аказваецца, гэта хатка рэмеза — птушкі, якая раней была занесена ў Чырвоную кнігу, а цяпер знаходзіцца ў прафілактычным спісе.

— Рэмезаў называюць ткачамі, бо яны будуюць вельмі мяккія і трывалыя гнёзды з рагозу. Не пужайцеся, што яны так хістаюцца, гэта мае практычную мэту — ніякі драпежнік туды не трапіць, — расказвае **Наталля АЗОЎСКАЯ, каардынатар Клуба беларускіх велабёрдараў,** пакуль мы спрабуем разгледзець у бінокль гняздо. — Адна птушка робіць некалькі такіх гнёздаў за год, мабыць на выбар, але выкарыстоўвае толькі адно і толькі адзін раз. Таму, магчыма, гэта хатка ўжо і нежылая.

Рухаемся далей. Менш чым за хвіліну пад'язджаем да другога інфармацыйнага стэнда. Дарэчы, такіх стэндаў у гарадку сем. На кожным з іх — цікавыя звесткі пра птушак, якія жывуць менавіта ў гэтых мясцінах.

— Тут вы можаце ўбачыць бакаса. Хто з вас ведае англійскую мову? — нечакана пытаецца Руслан Шайкін. — Па-англійску назва гэтай птушкі гучыць як «снайп», гэта значыць «выстрал». Пры ўзлёце яна вельмі хутка разганяецца, так што трапіць у яе амаль немагчыма, адсюль і чалавека, які метка страляе, называюць снайперам.

Амаль за тры гадзіны экскурсіі мы пачулі, убачылі альбо і пачулі, і ўбачылі каля 20 розных птушак. Сярод іх былі берасцянка, пячураўка-цянькоўка, пячураўка-будаўнічок, пячураўка-трашчотка, валасянка чорнагаловая, белая сітаўка і іншыя.

— Я ніколі раней не займалася бёрдвотчынгам, а велабёрдвотчынг для мяне зусім новая з'ява, — падзялілася ўражаннямі **адна з велабёрдараў-пачаткоўцаў Ганна.** — Я заўсёды любіла птушак, аднак мне вельмі цяжка запомніць іх назвы. Пасля экскурсіі стала значна прасцей. Вельмі прыемна, што ў Мінску яшчэ засталіся такія прыгожыя і некранутыя мясціны.

Далучайцеся да беларускіх велабёрдараў!

Кацярына ЦІТОВА

Другі пункт нашага маршруту — птушкі, якія жывуць на балоце.

■ Цікавы досвед

«У НАС УВОГУЛЕ НЯМА СМЕТНІЦЫ»

Як амерыканская сям'я з чатырох чалавек жыве без адходаў

Беа Джонсан — знакамітая актывістка-zero waste з Каліфорніі. За год яе сям'я з чатырох чалавек і сабакі ўтварае ўсяго адзін маленькі слоік адходаў. Яна прыехала ў Мінск па запрашэнні Цэнтра экалагічных рашэнняў, каб расказаць ахвотным, як у яе атрымліваецца жыць без смецця і эканоміць на гэтым не толькі грошы, але і час.

Кажам «не» непатрэбнаму

Безадходны шлях Беа Джонсан пачаўся з пераезду ў 2006 годзе. Тады яна заўважыла, што 80 % рэчаў доўгі час стаялі ў кладоўцы і так ні разу і не спатрэбіліся! Гэта навяло на думку пазбавіць сваё жыццё ад лішняга і пачаць займацца сапраўды важным — удзяляць больш увагі сям'і і сябрам, вандраваць і развівацца.

Метадам спроб і памылак Беа Джонсан выпрацавала пяць правілаў, якія дапамагаюць ёй камфортна жыць і не ўтвараць смецця. І першае з іх — гаварыць «не» непатрэбнаму.

— Скажыце «не» прадуктам у пластыкавай упакоўцы, аднаразовым рэчам, напрыклад трубачкам для напояў, пакетам, бясплатным рэчам, промаматэрыялам, папяровaму спаму (паштоўкам, флаерам і інш.). Як толькі вы нешта з гэтага бераце, адразу ж падтрымліваеце вытворчасць новага смецця. Узятая на канферэнцыі бясплатная ручка — наш спосаб сказаць «Бурыце новыя свідравіны, качайце нафту, вырабляйце новы пластык», — падкрэсліла Беа Джонсан. — Спатрэбіўся час, але мы ўсё ж дабіліся, каб нам у паштовую скрынку не кідалі ніякіх лістовак.

Скарачаем спажыванне

Аднак не ўсё адразу складвалася гладка. Па словах актывісткі, яна некалькі разоў «перагібала палку». Так, напрыклад, вырашыўшы не купляць шампунь, Беа Джонсан шэсць месяцаў выкарыстоўвала соду і воцат.

— Скажам шчыра, я не стала прывабнай прыгажуняй. А мой муж аднойчы сказаў мне: «Беа, чаму ад цябе заўсёды пахне вінегрэтам? Я так стаміўся». Тады эксперымент праваліўся, бо для мяне важна, каб прынцыпы zero waste не перашкаджалі асабістаму жыццю, — падзялілася актывістка.

Яшчэ адзін прыклад, які не закончыўся поспехам, — гэта спроба замяніць туалетную паперу на... мох!

— Я прынесла з лесу цэлы кошык імху — на наступны дзень ён ператварыўся ў грубую шчотку, якой карыстацца мы, вядома, не сталі. Таму ад туалетнай паперы мы не адмовіліся, але купляем яе, як і ўсё астатняе, без упакоўкі, — падкрэсліла Беа Джонсан. — Я гэта расказваю для таго, каб вы зразумелі, што некаторыя парады не працуюць, трэба не ўпадаць у крайнасці, а шукаць залатую сярэдзіну.

І сям'я актывісткі яе знайшла. Так, усе яны адмовіліся ад непатрэбнага адзення і пакінулі самае неабходнае. У Беа Джонсан, напрыклад, толькі дзве сукенкі, дзве спадніцы, дзве пары штаноў, адны штаны для ёгі і восем топаў. Аднак, па яе словах, гэтыя рэчы — шматфункцыянальныя і з іх жанчына можа скласці ажно 50 розных камплектаў. Касметыку яна робіць сама з прыродных матэрыялаў, купляе толькі тональны крэм.

— Калі ў мяне менш вопраткі, чым у вас, гэта не значыць, што ў мяне стала менш шанцаў выглядаць стыльна. Аднак усё маё адзенне ўмесціцца ў невялікі чамадан. Гэта вельмі зручна, бо не трэба губляць час на зборы, — падкрэсліла Беа.

Прынцыпаў мінімалізму жанчына прытрымліваецца і на кухні. З першага погляду падаецца, што дом Беа нібыта пусты, але на самай справе там проста няма нічога лішняга.

— Рэклама з усіх бакоў кажа, што для ракавіны нам неабходны адны мыйныя сродкі, для пліты — другія, а для вокнаў — трэція. Паверце, воцату з вадой дастаткова. Дадаткова мы купляем толькі мыла без упакоўкі. Ім мыем і рукі, і падлогу, і нашага сабаку Зізу, — расказала актывістка. — Таксама зразумела, што нам не трэба шмат посуду. З вялікай колькасці кухонных аксесуараў я пакінула толькі пяць. Навошта мне 10 аднолькавых лыжак, калі ў мяне і рук столькі няма?

Выкарыстоўваем паўторна

Усе аднаразовыя рэчы сям'я Беа Джонсан замяніла на шматразовыя. У іх няма нічога з пластыку. Па закупкі яны ходзяць толькі са сваёй тарай у спецыяльныя аптовыя крамы. І менавіта ланч-боксы носяць у тканіне. Па словах жанчыны, ніхто з іх не смяецца. Яны жартуюць, што дыета ў іх такая — zero waste.

Новае адзенне сям'я Беа купляе вельмі рэдка, а калі нешта патрэбна, то ідуць у сэканд-хэнд. Туды ж аддаюць і свае старыя рэчы.

Перапрацоўваем і кампастуем

Цікава, але Беа Джонсан заклікае перапрацоўваць не больш, а менш. Бо ў ідэале адходаў не павінна ўтварацца ўвогуле. Канцэпцыя zero waste якраз пра гэта.

— У нас няма сметніцы, а кантэйнер для перапрацоўкі меншы за чыхуахуа. Нам проста амаль няма чаго выкідваць. Тая ж сітуацыя і з кампостам. Улады нам дапамагаюць з гэтым, але мы ўсё роўна імкнёмся і арганікі ўтвараць па мінімуме. Напрыклад, не чысцім агародніну і садавіну. Вітамінаў у скурцы шмат, а смецця ўтвараецца менш, — падкрэсліла Беа Джонсан.

Кацярына ЦІТОВА.
Фота з асабістага архіва Беа Джонсан

■ Вы нам пісалі

«Што мне Вена, Мадрыд, што мне Лондан туманны,

Больш за ўсё я бацькоўскаму краю адданы...»

Каму належаць гэтыя радкі, чытачам «Звязды» нагадваць, мусіць, не трэба: ну вядома ж, Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу.
Пра любоў да Бацькаўшчыны, сваёй роднай зямлі хораша пісалі і іншыя творцы. У прыватнасці, жыццёвым крэда для многіх суайчыннікаў стала крылатае «Як жыць — дык жыць для Беларусі, а без яе — зусім не жыць» Ларысы Геніюш, на слыху пастаянна тыя ж «Слуцкія ткачыхі», «Мой родны кут...», «Я не ганю землі чужыя...» А ўзяць знакаміты паланэз Агінскага...

Фалькларыст Мікола КОТАЎ на сваёй Бацькаўшчыне.

Тэме Радзімы прысвячаюць свае лісты і многія з чытачоў газеты.

«Днямі наведаў вёску майго хроснага бацькі, маёй бабулі, — піша **спадар Мікола Котаў з Мінска,** — *вёску, дзе маленькім я поўзаў па сцежцы, а крыху падросшы, разам з іншымі хлопцамі бегаў па вуліцы, гуляў у хованкі, купаўся ў блізкай сажалцы. І вада ў ёй была цёплая-цёплая...*

Хросны бацька Іван расказваў, што некалі на паверхні гэтай сажалкі з'явіліся незразумелыя чорныя плямы, а потым і агеньчыкі, бо тыя плямы нехта падпаліў... Тады, каб убачыць гэтае дзіва, з усёй вёскі збягаліся людзі, крычалі адно аднаму: «Глядзіце, вада гарыць!.. Вада гарыць!». З таго часу Гарывадай сталі называць вёску, ад якой уласна і пачалася гісторыя беларускай нафты...

Цяпер той сажалкі ўжо няма, — паведамляе спадар Мікалай. — *Няма і бабулінай хаты. Апусцела вёска, хоць тут пабудавана новая ферма і на лузе пасуцца каровы.*

Каля адной з хацінак я ўбачыў бабульку. Падышоў да яе, павітаўся, прысеў на лаўку. Мы пазнаёміліся. Як аказалася, Настассі Іванаўне Мароз дзевяноста адзін год, яна памятае маю радню і тое, як знайшлі потым нафту, як запалілі вялікі факел на вышцы...»

Наведаў спадар Мікола і горад Рэчыцу, дзе некалі жыў з матуляй Праскоўяй Якаўлеўнай. А вось бацька яго, Конан Фёдаравіч, сына так і не ўбачыў, бо нарадзіўся той у снежні 1941-га. І толькі дзякуючы кіраўніку ветэранскай арганізацыі г. п. Уваравічы, што на Буда-Кашалёўшчыне, спадарыні Любові Родавай, амаль праз сем дзесяцігоддзяў даведаўся пра места гібелі бацькі — схіліў галаву перад помнікам. З тае пары, як піша, дарагім яму стаў і горад Баранавічы.

А Тураў, як і Рэчыца, дарагім быў даўно, бо там, на зямлі свяціцеля Кірылы Тураўскага, спадар Котаў палюбіў беларускія традыцыі, народныя абрады, сустрэў нямала дарагіх яму палешукоў. І сярод іх — фермера Міхаіла Рыгоравіча Шруба, які дапамагае фальклорным гуртам, самадзейнай дзіцячай творчасці...

«А калі наогул, — падсумоўвае спадар Мікалай, — *то ў кожнага чалавека, які трохі пажыў на гэтай зямлі, ёсць, як мне здаецца, не проста малая радзіма, якую трэба ўсім сэрцам берагчы, ёсць Бацькаўшчына».*

«У кожнага яна свая — у горадзе, у невялікім мястэчку, у вёсцы, на хутары, аднак, незалежна ад гэтага, аднолькава дарагая», — чытаем у лісце **з Лагойшчыны ад спадарыні Лідзіі Лук'янавай.**

На яе думку, многія вяскоўцы пераехалі ў гарады, маюць добрую працу, сем'і, кватэры з выгодамі, але ж, як бы ў іх добра не жылося, пры першай магчымасці рвуцца праведаць бацькоў ды родзічаў (і жывых, і тых, хто ўжо на пагосце), прайсціся па вёсцы, па школе.

У ёй, відаць, як нідзе, адчуваеш сувязь з мінулым. Ідзеш па калідоры і забываеш, што ты — сталы чалавек. Здаецца, вось зараз убачыш некага з настаўнікаў, аднакласнікаў ці проста знаёмых з краіны дзяцінства.

«Я памятаю, як мы перасяляліся ў новую школу. Гэта ж падумаць: нейкіх дзесяць гадоў па вайне, а ў дзяржавы ўжо знайшліся сродкі на прыгожы двухпавярховы будынак!.. Мне здаецца, нас правільна там выхоўвалі, — піша спадарыня Лук'янава, — *вучылі жыць і працаваць на карысць Радзімы. Кожную восень, напрыклад, мы, школьнікі, дапамагалі сваёй гаспадарцы ўбіраць ураджай морквы, капусты, буракоў. Не паверыце: на поле ішлі з песнямі. Я ні разу ў жыцці не чула, каб нехта пытаўся, колькі нам будуць плаціць? Не спадзяваліся мы і на гарачыя абеды, хоць, шчыра кажучы, есці хацелася. Згрызеш тады нейкую моркву ці бручку — і здаволішся. А калі да гэтага і настаўнік пахваліць, дык быццам пяцёрку атрымаў!..*

А якія ў нас былі святы! Рыхтаваліся да іх усе класы, спаборнічалі, хто лепей выступіць перад вёскай, перад кіраўніцтвам саўгаса. Дырэктар Цімох Ягоравіч Смірноў (былы франтавік) абавязкова прыходзіў, і такім чынам атрымлівалася, што нас выхоўвалі не толькі бацькі, не толькі настаўнікі, а ўвогуле дарослыя, само вясковае жыццё. Усёй школай восенню або вясной мы саджалі кветкі, кусты, дрэвы (два скверы ў цэнтры вёскі), прыбіралі тэрыторыю — упрыгожвалі сваю зямлю.

Аднаўляліся тады вёскі, будаваліся шматкватэрныя дамы (праўда, накшталт баракаў, але ж добрыя), дзіцячыя садкі, бальніцы, клубы, лазні, магазіны.

Цяпер многае па-іншаму, — лічыць спадарыня Лук'янава. — *З'явіліся арандатары, прадпрымальнікі, асобныя — нават «раскруціліся», як той казаў, аднак думкі ў іх усё роўна пра грошы, а не пра людзей, якія жывуць на гэтай зямлі. А мне здаецца, калі ты ўжо такі багаты, дык хоць нешта зрабі: тую ж лазню збудуй...»*

Згодна з адной версіяй, слова «багаты» ўтварылася ад слова «бог»: многа ў чалавеку бога — ён багаты, мала — тады хай чакае бед (бедны).

Паводле прыказкі, першы другому не спагадае: багаты не ведае, чым бедны абедае.

Гэта і так, і не, бо, згадзіцеся, нямала ёсць прыкладаў, калі ўраджэнцы канкрэтных мясцін на Бацькаўшчыне будавалі храмы, помнікі землякам, дарогі, адкрывалі крамы і музеі, матэрыяльна дапамагалі школе...

Былы малалетні вязень фашызму **спадар Уладзімір Жогла з Мазыра** таксама хацеў дапамагчы ёй, але па-іншаму. Даслоўна: *«...Галоўная мэта Года малой радзімы — навесці парадак, зрабіць Беларусь узорна-паказальнай і з годнасцю падысці да міжнародных спартыўных спаборніцтваў, да 25-годдзя новай Канстытуцыі. Гэта — вялікае свята,* — лічыць Уладзімір Мікалаевіч. — *У нашым календары іх наогул шмат: адзначаем цэлымі пасяленнямі. І машын шмат, але сёння гэта ўжо не паказчык дастатку, а часта наадварот — сродак для заробкаў. А колькі тавараў у крамах, колькі магчымасцяў для адпачынку... Вось і атрымліваецца, што многія ўзахлёб расказваюць пра Егіпет, замест таго каб пагаварыць пра сваё, роднае».*

«Паглядзіце на сённяшнія вёскі не ўздоўж дарог, а ў глыбінцы, — прапануе аўтар ліста. — *Жыцця там, асабліва па вечарах, амаль няма, не свецяцца вокны нават у клубах... Для прыкладу спашлюся на сваю малую радзіму — вёску Буйнавічы Лельчыцкага раёна. Не так даўно пражывала ў ёй больш за тысячу чалавек, сёння — на палову менш. Сумна ўсведамляць, што міне яшчэ з дзясятак гадоў і ў жывых не застанецца нікога, хто быў удзельнікам вайны ці хоць бы сведкам тых жудасных падзей. Становіцца крыўдна за ветэранаў, бо многае забываецца.*

